Агратурызм з Казлоўскімі ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Орля па-свойму? ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 51 (2745) Год LIII | Беласток, 21 снежня 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Бязмежжа-2008. Вяртанні

Фота Міры ЛУКШЫ

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Сёлетні, дванаццаты ўжо польска-беларускі літаратурны семінар „Бязмежжа” закончыўся ў апошнюю нядзелю (14.12.) у агратурыстычнай гаспадарцы „Бора-Здруй” у Новым Ляўкове Нараўчанскай гміны. Прэзентаваліся літаратары, якія ствараюць па-беларуску па абодвух баках мяжы. Распавялі яны пра свае творчыя змаганні і прадставілі свае найнавейшыя дасягненні.

Несумненна, клімат месца, у якім праводзілася гэтае трохдзённае спатканне, спрыяў дэбатам і разважанням над кандыцыяй беларускамоўнай літаратуры і беларускай тоеснасці агулам. Падтрымаў яго ў час інаўгурацыі сваёй прысутнасцю войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч.

Першы дзень, а ў прынцыпе вечар, прысвечаны быў пісьменніцкай (празатарскай і паэтычнай) творчасці Міраславы Лукшы, штодзень публіцыстыкі „Нівы”, якая сёлета адзначае юбілей 50-годдзя з дня нараджэння і 35-годдзя творчай працы і пры гэтай нагодзе выдала збор апавяданняў „Гісторыі з белага свету”. Былі падзякі, успаміны самой аўтаркі, урэшце чытанне напісанай ёю літаратуры. Падобна як на наступны дзень, у час сустрэчы з Ганнай Кандрацюк-Свярубскай (таксама журналісткай „Нівы”, рэдактаркай ніўскай „Зоркі”) і прэзентацыі яе найнавейшай кнігі „Царская трызна”, нельга было пазбыцца ўражання, што абедзве літаратаркі цішком пераносяць у сваіх кніжках „жмені” праўд пра тутэйшых беларусаў і аб беларускім свеце Беласточчыны і самой беластоцкай метраполіі, у якой у цяперашнім дарослым жыцці прыйшлося ім жыць.

— Гэта крышынка тутэйшых лёсаў, — гаварыў Яўген Вапа, галоўны рэдактар „Нівы”, старшыня Беларускага саюза ў РП, мадэратар семінара.

— Гэта быў мой абавязак, апісанне свету, з якога я выйшла. Вельмі балюча адчуваю смерць нашага народу, — прызналася аўтарка „Царскай трызны”, што выказвае ў апісваных гісторыях таксама Міра Лукша.

Гэта тычылася таксама выступлення Міхала Андрасюка, пісьменніка з Гайнаўкі, журналіста Радыё „Рацыя”, а таксама мастака і паэта Віктара Стахвюка, які ў свой час вярнуўся на Беласточчыну з Чэнстаховы. Матыў „тутэйшых” далося адчуць таксама ў час прэзентацыі некалькіх фільмаў Міколы Ваўранюка (журналіста Тэлебачання Беласток і БелСат) і памерлай ўраджэнкі Нараўкі Тамары Саланевіч („Ці чуеш як плача зямля”, аб вёсках затопленых у цяперашнім вадасховішчы Семяноўка). У сваю чаргу фільм спявачкі і журналісткі „Нівы” Ілоны Карпюк (праца зрэалізаваная ў закончанай ёю варшаўскай Акадэміі фільму і тэлебачання) быў кранальна асабістым і распавядаў пра людзей з ваколіц, з якіх паходзіць яе род, значыць, з Барнацкага Мосту і Гнільца, мясцовасцей распаложаных у пару кіламетрах якраз ад Новага Ляўкова. Як адкрыла сама рэжысёрка, яе фільм узнік дзякуючы любові бацькоў і яе павагі да старэйшых людзей і жыццярадаснасці.

Удзельнікі семінара з зацікаўленнем слухалі Тадэвуша Кшыжанскага, прапраўнука ў прамой лініі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, які з сям’ёй у 1945 годзе перасяліўся з Беларусі ў Кракаў, дзе працаваў у тамашнім асяродку тэлебачання, а пасля ў Нараўчанскую гміну:

— Калі я пачуў гэтыя спевы, гэтую мову, вярнулася маё дзяцінства. Ад дзевяці гадоў з’яўляюся жыхарам Альхоўкі, дзе з дзецьмі вёў заняткі з рысунку і малюнку. Цяпер з моладдзю працуем над рэалізацыяй фільмаў аб гэтай ваколіцы, аб гісторыі Нараўкі.

Аб сваіх працах і развагах расказваў таксама мастак Віктар Кабац:

— Я не люблю слова „тутэйшы”, бо гэта называе чалавека ніякага.

Галоўны рэдактар Радыё „Рацыя” Яраслаў Іванюк расказаў аб інтэрнэт-старонцы „Камунікат” — электроннай беларускай бібліятэцы. Госці з Беларусі чыталі фрагменты сваіх навейшых кніг. Алесь Пашкевіч пераконваў:

— Найважнейшае — тое, што для беларускага слова няма мяжы, таксама дзяржаўнай. Мы адчуваем сябе па абодвух баках мяжы спалучанымі адной справай, беларускай.

Вялікае ўражанне выклікаў Алесь Пашкевіч, старшыня Саюза пісьменікаў Беларусі, чытаючы эсэ „Яна”, якое нечакана ў палове тэксту аказалася быць іранічным аповедам аб бульбе.

Барыс Пятровіч Сачанка гаварыў пра адносна элітны літаратурны часопіс „Дзеяслоў”, які неўзабаве трапіць у шырэйшае распаўсюджанне ў кнігарнях і кіёсках у Беларусі. Прачытаў ён некалькі фрагментаў са зборніка „Жыць нястрашна. Фрэскі”, які карыстаецца папулярнасцю таксама па-за межамі Беларусі, між іншым, у Швецыі. У кнізе змяшчаюцца апавяданні і вершаваная проза з апошніх дзесяці гадоў.

— Штораз часцей на Захадзе гавораць „Беларусь”, а не як дагэтуль „White Russia”, — адзначыў.

Паэт Уладзімір Някляеў прыгадаў, што стараўся сустварыць у Польшчы Беларускі інстытут, які займаўся б беларускай культурай; на жаль, безвынікова. Несумненна ў па-майстрэску акцёрскім стылі дэкламаваў ён свае вершы. У адным з іх пісаў пра сябе і пытаўся ў Бога, ці яму ён сніцца і закончыў: „Ты не снішся мне, Валодзя — Бог не спіць!”.

Алена Макоўская, старшыня Рады Згуртавання беларусаў свету „Бацькаўшчына” ўспомніла пра праблемы з беларускай ідэнтыфікацыяй:

— Цудоўныя перамены пачатку дзевяностых гадоў у Беларусі не знайшлі завяршэння (...). Беларусь ужо вядомая, але яе лагатып усё чорны, бо з’яўляецца ім прэзідэнт (...). Беларусы — гэта людзі, якія не ўмеюць самі ідэнтыфікавацца (...). Беларусы ідэнтыфікуюцца, калі маюць дачыненне з варожымі сіламі (...). Наш патрыятызм застаўся быць местачковым, з пералому XIX і XX стагоддзяў. (...). Хочам паступова будаваць мост паміж беларускай і рускамоўнай Беларуссю.

Раней адзначыла:

— Беласточчына гэта для мяне чароўная краіна, якую ўсё да канца не ўмею зразумець, але дае яна сілу і натхненне нам, беларусам.

Паэт Алесь Аркуш (які цяпер працуе на „Рацыі”) прадбачвае выданне неўзабаве ў Вільні новага зборніка вершаў, які складаецца з чатырох частак, кожная з якіх прысвечана іншаму гораду, блізкаму аўтару:

— Я пачаў пісаць раман, паколькі кожны сур’ёзны аўтар павінен выдаць прынамсі адзін раман, — прызнаўся крыху жартаўліва.

Міхась Скобла пахваліўся найнавейшай анталогіяй сусветнай літаратуры ў перакладзе на беларускую мову. Апынулася там аж 658 аўтараў, за пераклад якіх узялося аж 198 перакладчыкаў.

Удзельнікі семінара былі пад уражаннем аграгаспадаркі спадарства Барыса і Людмілы Казлоўскіх на хутары Лазовае ў Новым Ляўкове, іх мясцовага музея і своеасаблівага санаторыя, а таксама галерэі імя Тамары Саланевіч у Нараўцы, роднага дому Ілоны Карпюк, песень спяваных Зміцерам Бартосікам.

У кулуарах удзельнікі семінара разважалі над магчымасцю сарганізавання ў Мінску прэзентацыі разнароднай творчасці беларусаў Беласточчыны. XII „Бязмежжа” было сарганізавана Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва”, Беларускім саюзам у РП пры медыйнай дапамозе Радыё „Рацыя” і фінансавай падтрымцы польскага Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі.

Слухай сваё

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

98,1 FM

БЕЛАСТОК, ГРОДНА, СУВАЛКІ, СВІСЛАЧ, БЕЛЬСК-ПАДЛЯШСКІ, МАСТЫ, ГАЙНАЎКА, ВАЎКАВЫСК, СЯМЯТЫЧЫ, ВЫСОКАЕ

БЕЛАРУСКАЕ РАДЫЁ РАЦЫЯ

Першае незалежнае, трансгранічнае, радыё!!!

Мы даступныя кругласутачна ў Інтэрнэце!

www.racyja.com

Адрас:
Białoruskie Radio Racja
ul. Ciepła 1/7
15-472 Białystok
e-mail: info@racyja.com
tel. 085 654 51 93
Skype: racyja
тэл. для слухачоў у студыі
+48 85 654 51 51
тэл. для SMS у студыі
+48 500 701 702
Рэклама

9 770546 196000

„... у вартасці і правах”

Дзесятага снежня беларускія праваабаронцы выйшлі на вуліцы сваіх гарадоў, каб урачыста адзначыць шасцідзесяцігоддзе прыняцця Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. Удзельнікі мерапрыемстваў, апранутыя ў вопратку з адпаведным надпісам, раздавалі мінакам інфармацыйныя матэрыялы пра само свята, пра стан з правамі чалавека ў Беларусі, дарылі кніжачкі з тэкстам Дэкларацыі, расклейвалі плакаты з яе зместам, віншавалі суайчыннікаў святочнымі сцяжкамі з юбілейнай датай. Але, як спяваецца ў старой беларускай песні, „свята доўга не цягнулась”. Практычна паўсюдна, дзе на вуліцах з'яўляліся праваабаронцы, як з-пад зямлі выраслі постаці супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Удзельнікаў мерапрыемства затрымлівалі, матэрыялы забіралі. Затрыманых прымушалі пісаць тлумачальныя. А што можна было напісаць у тых тлумачальных? Можа аб правах чалавека ў свеце і ў нашай краіне? Ці пра тое, што „ўсе людзі нараджаюцца вольнымі і роўнымі”...

„Усе людзі нараджаюцца вольнымі і роўнымі ў сваёй вартасці і правах. Яны надзеленыя розумам і сумленнем і мусяць ставіцца адзін да другога, грунтуючыся на прынцыпах братэрства”. Такімі словамі, запісанымі ў першым артыкуле, пачынаецца Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека. Здаецца, простыя і адначасна вялікія словы цалкам зразумелыя кожнаму чалавеку. Бо яшчэ з Бібліі мы ўсе ведаем, што іншым людзям трэба рабіць толькі тое, што хочаш, каб рабілі табе. Гаворачы простай мовай — ставіцца адзін да другога, грунтуючыся на прынцыпах братэрства.

Прынятую Генеральнай Асамблеяй Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека ніхто не аспрэчыў і аніводная краіна не заявіла, што ў яе змесце ёсць нешта непрымальнае. У гэтым дакуменце ўпершыню былі зафіксаваны ўсеагульныя правы чалавека для ўсіх і для кожнага. Дэкларацыя стала эталонам, да якога па прыродзе сваёй імкнецца чалавецтва. Яна перакладзена на 360 моў свету, у тым ліку і на беларускую.

Калі гаварыць пра Беларусь, то наша краіна была ў ліку першых, хто меў гонар падпісаць гэты вялікі дакумент. Адразу пасля Другой сусветнай вайны, у чэрвені 1945 года, тагачасная БССР стала краінай-заснавальніцай Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. І хоць наша Радзіма была ў палоне савецкай імперыі, але па волі лёсу і яго вышэйшаму прадвызначэнню незалежнага шляху нашага народа, 10 снежня 1948 года Беларусь падпісала Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека як незалежны суб'ект міжнароднага права.

З тае пары прайшло шэсцьдзесят год і безліч палітычных ды сацыяльных змен. Пацвердзіўшы старую мудрасць пра тое, што нішто не вечнае пад месяцам, знік з карты свету і СССР. Многія палоненыя ім народы змаглі аднавіць сваю незалежнасць. Некаторыя нават увайшлі ў Еўрасаюз і НАТА. Іншым, у тым ліку і беларусам, пакуль што не ўдалося вырвацца з-пад геапалітычнага і эканамічнага ўплыву правапераемніцы Савецкага Саюза — Расіі. Па-рознаму выглядае на былой савецкай прасторы і сітуацыя з правамі чалавека.

Беларусь у гэтым аспекце мае мала чым пахваліцца. На шэсцьдзесят першай сесіі, заслухаўшы спецыяльнага дакладчыка па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі Андрыяна Севярына, Камісія па правах чалавека ААН выказала „глыбокую занепакоенасць” па цэлым шэрагу праблем, звязаных з парушэннем правоў чалавека ў Беларусі. Праваабаронцы свету звярнуліся да беларускага кіраўніцтва з заклікам забяспечыць сваім грамадзянам элементарныя правы і выконваць падпісаныя Беларуссю ў 1948 годзе абавязацельствы. Толькі беларускае кіраўніцтва не асабліва прыслухваецца да гэтых рэкамендацый.

Затрыманых 10 снежня праваабаронцаў зрэшты паадпускалі. Ці атрымаюць яны пакаранні за сваё жаданне адзначыць юбілей падпісання сваёй роднай краінай самага гуманнага дакумента планеты ім не сказалі. Але змагары за правы чалавека сваю місію выканалі — нагадалі сваім суайчыннікам, што „ўсе людзі нараджаюцца вольнымі і роўнымі”. Ды і ў супрацоўнікаў сілавых структур з'явілася дадатковая мажлівасць азнаёміцца з тэкстам дэкларацыі. Ім жа трэба, перш чым пісаць рапарт пра затрыманне, хоць павярхоўна, але прачытаць яе.

Віктар САЗОНАЎ

Перад пантэонам

Памёр Аляксей Рыдыгер, маскоўскі патрыярх. Звычайна, пры нагодзе адыходу на вечны спачынак, над пакойнікам людзі вершаць свой суд, ацэньваюць сумесную зямную вандроўку ягоных душы і цела. Існуе такі ветлівы прынцып, што пра пакойніка гаварыць трэба цёпла, што дрэнна ўспамінаць спачылага не выпадае, бо ж ягоным блізкім і так гора.

Гэта ў прыватнасці, бо людзей афіцыйнага маштабу народ і так абгаворыць на свой лад. Але ў выпадку патрыярха, ці — больш маштабна кажучы — іншай рэлігійнай фігуры меркаваць пра пакойніка прыходзіцца з улікам некаторых абмежаванняў. Ну, дапусцім, што такі чалавек жыў сваёй асабістай штодзённічнай, меў свае меркаванні наконт розных падзей ці іншых меркаванняў. І ці маглі тыя ягоныя, чыста асабістыя меркаванні не супадаць з такімі, якія ён выказваў афіцыйна, на якія яму дазваляў этыкет ягонай пасады, звязваючыя яго табу? Ці ён дапускаў нейкае асабістае стаўленне да тых табу, ці не бачыў патрэбы іх нейкай мадыфікацыі? Ці назіранне абароту спраў у сферы, у якую ён скіраваў свае жыццёвыя крокі ў маладым узросце, на працягу доўгіх гадоў не выклікала ў ім крытычных рэфлексій?..

Можа такі чалавек на віднай пасадзе пісаў нейкія мемуары, у якіх заключыў свае чыста асабістыя погляды? Здаецца мне, што такая дзейнасць немагчымая. Бо ж чым важнейшы саноўнік, тым больш прыслужнікаў яго акружае, якія сочаць за кожным ягоным рухам, за кожным ягоным позіркам, за кожнай яго пісулькай. Ды катавасяцца прыслужнікі вакол яго, то яго апранаючы, то падаючы ваду ці віно, то падсоўваючы пісульку, якую недзе трэба прачытаць. І падмятаюць яны пад дыван яго магчымыя вольныя і нявольныя хібы. Бо ў выпадку патрыярха Аляксея, які жыў у вельмі складаны для царкоўнага жыцця час, маглі здарыцца і цалкам свядомыя ўступкі...

Дапусцім, аднак, што пакойны патрыярх Аляксей меў магчымасць напісаць свае чыста асабістыя занатоўкі, свае дзённікі, свае мемуары. Калі б такое здарылася, ягоныя творы вартыя былі б асаблівага зацікаўлення, бо ж жыў ён у даволі бурную эпоху, у краіне, якая многім людзям звонку здавалася казачнай, ды быў прысутны ў тым там сектары грамадскага жыцця, дзе патрэбныя былі і кемлівасць, і адвага, і пакручастасць. Ды быў на такой іерархічнай вышыні, адкуль нямногім відаць многае...

Аднак калі нават і ўдалося б такому саноўніку нейкім патайком пакінуць на паперы плён сваіх назіранняў, хроніку сваіх вымушаных абставінамі хітрыкаў з няпростага часу, сумняваюся, ці згаданыя ўжо ягоныя цівуны не замялі б такой ягонай спадчыны пад дыван, прынамсі часова... Бо на тое тыя вартавыя саноўніка і ёсць, каб пільнаваць ягонага іміджу, каб навонкі выглядаў ён прыцягальна, без ніякіх слабасцей характэрных жыццёвай мітусні звычайных смяротнікаў.

Ды і людзі ж патрабуюць бачыць перад сабою кумірaў, нейкіх казачна прынцыповых, часта выхадцаў з простага народу, якія пасля становяцца царэвічамі ў нейкім царстве; можа быць гэта царства кіно, можа быць царства спорту, царства песні ці царства нейкага іншага рытуалу. Хто ж з ненаймалодшага нашага пакалення не помніць брытанскай прынцэсы Дыяны, брытанскага спевака Джона Ленана ці прызабытага польскага акцёра Збышка Цыбульскага. А калі заглянуць у пакойчыкі, дзе пражываюць нашы маладыя людзі, ці ж не аздоблены яны каляровымі іміджамі іхніх любімцаў? А калі заглянуць у царкоўныя календары, там таксама пабачым партрэты, знятыя ў строга акрэсленым антуражы.

У нашым грамадстве рэлігійныя саноўнікі ў пашане. Таму і адыход на вечную пенсію маскоўскага патрыярха Аляксея ўспрымаю з жалем, са своеасаблівай разнавіднасцю тугі. Пройдзе час, калі ўзнятыя ягонымі саноўніцкімі рашэннямі хвалі затухнуць у „жыцейскім моры”, калі ягоныя сляды замяце час, калі ён беспаваротна адыдзе ў гісторыю. І спадзяюся, што толькі тады, калі пахаваюць яго мас-медыі, нехта зможа ўзяцца за разважную ацэнку ягонай няпростай біяграфіі. І можа тады нешта ўсплыве, пра што мы ў наш час не ведаем, нешта, што выкліча не толькі павагу, але і звычайную чалавечую ўсмешку. А можа і шчыры жаль, бо ж ніколі невядома, што можа задумацца ягоным наступнікам.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Пасвяткавалі (2)

І зноў я трапіў на „імпрэзу”, у час якой чыноўнікі кайфавалі ад уражання, што яны такія адметныя ў сваіх дасягненнях. — Мы шмат зрабілі, — гаварыў падляшскі ваявода (прадстаўнік урада ў глыбінцы). — Было варта! — пераконвала адна з маладых працаўніц Падляшскай ваяводскай управы. Апошнія заявы гучалі ў падобным тоне ў час „імпрэзы”, падводзячай вынікі рэалізацыі праектаў у рамках Інтэграванай праграмы аператыўнага рэгіянальнага развіцця (ІПАРР) у 2004-2006 гадах. Тлумачу, што тая праграма, падмацаваная еўрасаюзнымі грашыма, мае давесці да паляпшэння інфраструктуры дарог, каналізацыйнай і водаправоднай сетак, умоў ва ўстановах аховы здароўя і школах, а таксама мае служыць аднаўленню гістарычных, турыстычных і спартыўных аб'ектаў. У згаданых гадах з амаль трох мільярдаў еўра Падляшскаму ваяводству дасталося 110 мільёнаў.

„Стратэгічнай мэтай ІПАРР было стварэнне ўмоў росту канкурэнтаздольнасці рэгіёнаў ды супрацьдзеянне маргіналізацыі некаторых вясковых абшараў у такі спосаб, каб спрыяць працягламу гаспадарчаму развіццю краіны, яе эканамічнай, грамадскай і тэрытарыяльнай зладжанасці ды інтэграцыі з ЕС” — гэтыя словы можна прачытаць у спецыяльна выдадзеным (нікому непатрэбным?), у лакіраваным пераплёце, на пышнай каляровай паперы ды надта ж неахайна па друкарску афармленым, у больш чым на пяцідзесяці старонках альбоме (!!!): „ІПАРР у Падляшскім ваяводстве”. З гэтага выдання, падобна як і ў час падагульнення ў Падляшскай ваяводскай управе (ПВУ), можна даведацца, што ў рамках Праграмы пабудавана або мадэрнізавана на Падляшшы 218 кіламетраў дарог, 477 км водаправоднай і каналізацыйнай сетак, 18 мадэрных аб'ектаў ачышчальняў сцёкаў і станцый ачысткі вады, 28 тыс. кв. метраў плошчы будынкаў, прызначаных для навучальных і спартыўных мэт, было куплена 218 штук абсталявання для медычных устаноў і было мадэрнізавана 9 шпіталяў, былі куплены 49 гарадскіх аўтобусаў, адрамантавана 13 тысяч квадратных метраў камяніц ды 52 тыс. квадратных метраў гістарычных і культурных аб'ектаў (з гэтай пулькі грошы трапілі таксама на першы этап рэстаўрацыі старажытных памяшканняў на патрэбы Супрасльскай акадэміі; больш за 2,6 млн. зл.). У час піру, які працягваўся дзве гадзіны ў ПВУ, ваявода Мацей Жыўна пераконваў, што найбольшы гонар адчувае з-за таго, што ў рамках ІПАРР засноўваны былі і разбудоўваліся мікрапрадпрыемствы. Агулам датацыі атрымала 147 такіх прадпрыемстваў.

У ваяводскай управе аб усіх гэтых поспехах гаварылі працаўніцы г.зв. ніжэйшага ўзроўню якраз гэтай установы і іншых устаноў, якія вырашалі аб размеркаванні грошай з ІПАРР. З мінуты на мінуту канферэнц-зала ПВУ пусцела. Дарэчы, ужо на пачатку было тут менш людна чым напалову залы. Войтам, прадпрымальнікам і іншым (таксама патэнцыяльным) бенефіцыянтам ІПАРР, выразна ахопленым нудою ад выступленняў, нават не хацелася дачакацца пачосткі (шведскі стол у фае ПВУ). Шмат хто не дачакаўся нават выступленняў войтаў узнагароджаных ваяводам гмін: Крыпна, Харошчы і Браньска. Былі яны вылучаны за — агульна кажучы — „аператыўнасць і крэатыўнасць” у падрыхтоўцы і рэалізацыі праектаў. А я ў вас пытаюся, нашто быў гэты чарговы выпяндрож? Прытым не стаўлю пад сумненне карысці ад ІПАРР.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

На сваім з душой і сэрцам

Тэкст і фота Алексея МАРОЗА

Турыстам, айчынным і замежным, якія хочуць адпачыць, а нават крыху падлячыцца, свае паслугі прапануе агартурыстычная кватэра „Бора-здруй”, распаложаная непадалёк ад Новага Ляўкова. Можна тут падлячыць суставы, палепшыць кровазварот, амалодзіць скуру ці паскорыць працэс адпачынку і навучыцца як лячыцца зёлкамі. У Белавежскую пушчу турысты прыязджаюць з-за чыстага паветра. Аднак, каб у агракватэру прыцягнуць турыстаў, трэба забяспечыць ім даволі высокі стандарт начлежных ды харчавальных паслуг, што і робяць Людміла і Барыс Казлоўскія. Апрача лячэння зёлкамі, дэманстрацыі як з дапамогай лазовага прутка вызначыць вадацёк, які, пераходзячы пад домам, можа выклікаць бяссонніцу, спадарства Казлоўскія сталі прапанаваць адукацыйныя паслугі ў сваёй „Лясной галерэі”. Вучні і дарослыя могуць знаёміцца ў ёй з выглядам жывёл і птушак Белавежскай пушчы, з іх спевам і водгукамі, запісанымі ў лесе з дапамогай электроннай тэхнікі. Аднак самую вялікую каштоўнасць складаюць даўнія, рэдкія прылады працы земляробаў, сталяроў і цесляроў, якія можна пабачыць у клуні-музейчыку і побач яго.

Людміла і Барыс Казлоўскія ў пакоі, абсталяваным на даўні лад, што збудаваны ўсярэдзіне клуні-музейчыка

Можна падлячыцца

Людміла і Барыс Казлоўскія рашыліся на эксперымент і пайшлі далей, чым уласнікі агратурыстычных кватэр у наваколлі. Апрача падставовых турыстычных атракцыёнаў прапануюць прыезджым лячэбныя працэдуры ў адварах сена і хвошчкі. У іх кватэры прапануецца таксама награванне суставаў у гарачым спецыяльным пяску.

— У гарачым пяску вельмі ахвотна гуляюць дзеткі, што ў зімовы час дае ім магчымасць вярнуцца ў летні клімат, — кажа Людміла Казлоўская, родам з Пасталова каля Дубін, дзе яе брат таксама вядзе агратурыстычную дзейнасць і гадуе коней.

Бора Казлоўскі, галоўны спецыяліст у сям’і па лячэнню, прапануе адну або дзве лячэбныя працэдуры ў ванне або пяску і з дапамогай фільмаў і інструктажу вучыць, як у хатніх ваннах лячыць хваробы, карыстаючыся адварамі зёлак, а адначасна так дазаваць колькасць і частотнасць працэдур, каб не пашкодзіць арганізму.

— Ідэя арганізавання паслуг для турыстаў паявілася пасля нашай паездкі ў санаторый. Вярнуўшыся дамоў, мы падумалі, што лячэнне з дапамогай зёлак і тэхнікі мы можам прапанаваць у агратурыстычнай кватэры, — кажа Барыс Казлоўскі, майстар на ўсе рукі, які, арганізуючы агратурыстычную дзейнасць, многа прац выконваў самастойна або з дапамогай жонкі і сямейнікаў. — З хлява, які стаяў непадалёк ад дома, астаўся толькі шырокі калідор мураванага агратурыстычнага комплексу, дзе ўсе пакоі былі дабудаваныя.

Менавіта ў гэтым вялікім мураваным будынку частку памяшканняў спачатку займалі гаспадары, бо агратурыстычную дзейнасць можна было весці толькі ў тым самым доме, у якім жылі яго ўласнікі. Зараз там усе пакоі, кухня, ванныя і туалеты абсталяваныя па-сучаснаму, разам з дзіцячай пляцоўкай. Тут у харчавальным памяшканні адбываецца прэзентацыя фільмаў аб дамовым лячэнні, а ў ваннах праводзяцца працэдуры з прымяненнем адвараў. Аднак апошнім часам штораз больш моладзі ў школьным узросце і маладых сямействаў, якія не патрабуюць яшчэ лячэння, стала наведваць кватэру Людмілы і Боры. Гаспадары, выходзячы ім насустрач, сталі разбудоўваць агратурыстычны комплекс у напрамку прапаноў для маладых людзей. Зараз у спадарства Казлоўскіх можа пераначаваць 31 асоба, аднак спадар Бора будуе чарговы будынак, у якім будуць кухня, некалькі начлежных пакояў і вялікая канферэнц-зала, у якой можна будзе ладзіць і вясельныя бяседы. Ужо і зараз маладыя пары прыязджаюць да Казлоўскіх на фатаграфічныя сесіі на фоне традыцыйнай вясковай хаты, вырабаў мясцовага рукадзелля і прыгожай прыроды.

У „Лясной галерэі” апрача макетаў жывёл і птушак на ўвагу заслугоўвае лясны фон з абарогам і містэрна выкананыя плеценыя агароджы

Збудавалі „Лясную галерэю”

Барыс Казлоўскі спачатку вядзе мяне ў „Лясную галерэю”, якая крыху напамінае музей Белавежскага нацыянальнага парку. Тут чучалы лясной жывёлы паказваюцца ў лясным антуражы і ў суправаджэнні водгукаў пушчы. Спадарства Казлоўскія адвялі на сваю галерэю даволі вялікую тэрыторыю і абгарадзілі яе плеценай з тонкіх галін агароджай. Такой жа самай агароджай абставілі вузкія дарожкі, з якіх можна глядзець на макеты жывёл і птушак. Самымі цікавымі паказаліся мне па-майстэрску выкананыя плеценыя агароджы і натуральны фон са стагамі і ляснымі дрэўцамі.

— Некаторыя стаўбцы, на аснове якіх мы плялі агароджу, гэта перасаджаныя дрэўцы, а іншыя проста ўкапаныя ў зямлю. Лазы да пляцення ў нас многа і покі выканалі нам на заказ даволі каштоўныя, бо ўсе абцягнутыя фольгай, макеты жывёл і птушак, мы амаль справіліся з агароджамі і выкананнем фону, — тлумачыць спадар Барыс. — Усё мы зрабілі ў гэтым годзе, пачынаючы яшчэ з ранняй вясны, а трэба было яшчэ зрабіць і падобную на вятрак вышку, з якой турысты робяць здымкі галерэі і наваколля. Жывёлай асабліва цікавіцца моладзь, якая прыязджае да нас на экскурсіі.

Макеты — вельмі добрыя дапаможнікі для вучняў, якія могуць прыязджаць сюды на ўрокі біялогіі, а пасля адпачываць пры вогнішчы, гуляць на спартыўных пляцоўках.

— Я расказваю пра Белавежскую пушчу, жывёлу і птушак, абводзячы турыстаў па „Лясной галерэі”, а пасля пускаю ім запісы галасоў жывёльнага свету. Прыезджыя ахвотна слухаюць спеў птушак. Пасля пускаю нашы беларускія песні, заахвочваю спяваць пры вогнішчы, — тлумачыць спадар Барыс. — Для моладзі стварылі мы магчымасць ладжання спаборніцтваў з улікам старадаўніх гульняў. Маладыя людзі могуць спаборнічаць ходзячы на хадулях, качаючы абручы ці страляючы з лука.

Самыя каштоўныя — музейныя экспанаты

Аднак, на маю думку, самыя вялікія каштоўнасці ў спадарства Казлоўскіх сабраныя побач і ўсярэдзіне клуні-музейчыка. Знаходзяцца там яшчэ неўпарадкаваныя экспанаты, змешчаныя на адносна невялікай прасторы. Калі аднак глянуць на іх музейную вартасць, яна вельмі вялікая. Сабраная там багатая тэхніка для механічнай і ручной апрацоўкі драўніны. Прылады для апрацоўкі льну ці малацьбы не памесціліся ў клуні і размешчаны побач яе. Хаця яны прыкрыты, аднак патрабуюць лепшага забеспячэння. Цікавай ідэяй было размяшчэнне ў клуні аднаго памяшкання са старой хаты, у якім развешаны ткацкія вырабы і прылады, якімі карысталіся гаспадыні. Іншыя хатнія прылады размешчаны пад сценамі клуні-музейчыка.

— Зараз трэба брацца за работу, каб упарадкаваць экспанаты ў клуні, павесіць іх на сценах, упрыгожыць наш скансэн макаткамі і іншымі тканымі вырабамі. Усё трэба было б падсвяціць, але не стае часу на ўсё. Ужо і зараз ладзяцца ў нас розныя сямейныя святкаванні. Аднак яны праводзяцца на паветры і толькі госці здымаюць пакоі на начлег, — гаворыць Людміла Казлоўская. — Найчасцей хочуць яны начаваць у хаце крытай саломай (прывезенай з Дубін). Мы давялі да яе ацяпленне і можна ў ёй начаваць круглы год.

Дэталі са старых хатаў выкарыстаны былі таксама ў час будовы доміка для гульняў на дзіцячай пляцоўцы, а побач будынкаў пад страхой (адзін без сцен і прызначаны для сталоўкі на паветры) знаходзіцца невялікая сажалка і звычайны калодзеж. Аднак для спадара Боры ён незвычайны.

— Гэты калодзеж збудаваны над крыніцай, з якой выцякае вада і плыве ў рэчку Баброўку. Я правяраў гэта асабіста, выкарыстоўваючы лазовы пруток. Правяраю таксама вадацёкі пад пакоямі для гасцей. Калі ёсць вадацёк, нельга ставіць над ім ложак, бо нават на дзесятым паверсе ў блоку цяжка будзе спаць над ім. Дастаткова крыху перасунуць ложак і з’явіцца лепшы сон, — удакладняе спадар Барыс.

У спадарства Казлоўскіх ёсць вялікі воз, які назвалі „бананзай” і возяць на ім гасцей на прагулкі па наваколлі. У іх 15 веласіпедаў прызначаных для індывідуальных экскурсій і 6 байдарак для плавання па Нараўцы.

— Турысты цікавяцца не толькі прыродай, але і мясцовай культурай. Хочуць, каб адазвацца да іх па-свойму і расказаць пра мінулае, — кажа спадар Барыс, які не толькі абслугоўвае турыстаў у сваёй агракватэры, але і з’яўляецца экскурсаводам для сваіх гасцей па наваколлі.

Своеасаблівая смаката...

Калі я падарожнічаў па Брэстчыне і рабіў закупкі ў беларускіх крамах, дзіваваўся, што да рахунку прадаўцы прыпісваюць цану ўпакоўкі (фольгавыя пакеты, мяшочкі). Такое прыкмячаў як у кааператыўных, так і ў прыватных крамах. Палякі гэтую звычку, мабыць, перанялі ад суседзяў, бо зараз і ў Чаромсе такое абавязвае. Пачаткова патрабавалі плаціць за „экалагічную" ўпакоўку. Напрыклад, у гайнаўскай пякарні па вул. Белавежскай хлеб і пячэнне кладуць у папяровыя кулькі. У Чаромсе ў магазіне „Левіятан" тавар клалі ў фольгавыя пакеты з „экалагічным надпісам" (каштуюць яны адно 10 грошаў). Цікавую справу пры-

Такая ўпакоўка каштавала 0,40 зл.

кмеціў я 11 снежня ў адной з мясцовых крамаў. Да рахунку было прыпісана 0,40 зл. за... пластмасавую каробку. Здарэнне засталося б непрыкмечаным, калі б я не пацікавіўся цаной смакавітай своеасаблівасці пад назвай „ласунак гаёвага". Каштаваў ён (0,18 кг х 12,90) 2,32 зл. плюс 0,40 зл. за пластмасавую каробку. Такім чынам смаката абышлася мне ў 2,72 зл. Можна спадзявацца, што неўзабаве скажуць плаціць нам за пластмасавыя баначкі для малочных прадуктаў ды шклатару. У рынкавай эканоміцы ўсё дазволена. Але, каб не дацца звесціся ў зман гандлярам, варта правяраць чэкі на месцы, бо тады стане вядомым, што купляем і за што плацім. У іншым выпадку пасля адыходу ад касы рэкламацыі не будуць разглядацца. Варта аб гэтым памятаць.

Уладзімір СІДАРУК

Вокам з Патокі

Пра Яську Людвіка

Залукі — вёска невяліка,
Нямнога там жыве людзей.
Адзін з іх зваўся Яська Людвік.
А ён быў проста дабрадзей.
Калі б я да яго прыехаў,
Заўжды абед мне добры даў.
„Прыедзь, калі ты толькі
можаш!" —
Заўжды мяне так запрашаў.
Цяпер ён у Каралёвым Мосце,
Пад мяккай жоўтаю зямлёй.
І мы тут, знайце, толькі госці.
Хутка і мы будзем з табой!
Але пакуль я жыці буду,
Дык не забуду пра цябе,
Бо ты заўжды быў
у мяне госцем,
А я быў госцем у цябе...

Мікола КРАЎЧУК

Як узяць зубра за рогі?

Найлепш ведае пра гэта Мацей Прыкоўскі,

які ўзяў Гран пры III выпуску Падляшскага фестывалю кароткіх незалежных фільмаў „ЗубрОФФка". Зачараваў ён журы небанальнай гісторыяй пра тое, як у адным з вядомых польскіх фільмаў з'явіўся вясковы конь. Праўда, за рогі статуэткі зубра аўтар асабіста яшчэ не ўзяў, бо на фестываль не даехаў. Затое было многа іншых аўтараў ды выканаўцаў, а ўсё паказвае, што ў будучыні будзе іх яшчэ больш.

— Фестываляў у Польшчы шмат, — кажа Ірэкс Янён з Пярэмышля, — і стараюся паказваць усюды свае оффы. На „ЗубрОФФцы" таксама ўжо трэці раз паказваю свае фільмы.

З чаго пачаць? Для звычайнага чалавека мастацкая навамова бывае часам зусім незразумелай, а калі яшчэ паглядзець крыху фільмаў маладых аўтараў, можа аказацца, што ў кінематаграфіі некаторым увогуле цяжка дагаварыцца з гледачом. Асабліва даказаў гэта новы кшталт фестывальнай праграмы ды даволі цікавая катэгорыя: „Акно на ўсход".

— „Офф" — гэта фільм, які паўстае з маёй уласнай патрэбы сказаць свету, што ляжыць мне на сэрцы, — дадае Ірэкс, — і не мушу слухаць голасу большасці гледачоў, ані прадзюсераў. Раблю тое, што мне самому найбольш падабаецца ў кіно.

Магія кіно прыцягвае штораз больш людзей. Квіткі даражэюць, часам няма чаго глядзець, а людзі ідуць.

— Бо яны патрабуюць прыгожай карцінкі, — кажа Кшыштаф Касёр, узнагароджаны ў катэгорыі студэнтаў за фільм „Усе дні", — таму зараз таксама прызы ідуць у рукі рэжысёраў, якія дбаюць пра эстэтыку кадра. Не любім, калі ва ўспрыманні перашкаджае нам нейкае смецце або кепская ігра акцёраў.

— Дзе тады месца на андэрграўнд, сваю экспрэсію?

— пытаю.

— У нашым выпадку, а кажу пра студэнтаў фільмавых школ, у планах заўсёды добрае кіно для гледача, які проста наведвае кінатэатр. Мы імкнемся стаць вядомымі ды цікавымі творцамі.

Я ўсё ж такі далей шукаю незалежнасці.

— Незалежнасць маеш заўсёды, калі выбіраеш тэму, калі ніхто не загадвае табе, нават у школе, пра што маеш рабіць фільм, — дадае Кшыштаф.

Нікога нібыта ніхто не прымушае, але кіно дзеліцца на гэтак званы галоўны нурт ды незалежнае асяроддзе. Нават фестываль „ЗубрОФФка" здаецца падтрымліваць гэты падзел, таму з'явіліся дзве катэгорыі: студэнцкая (з памкненнямі да вялікага кіно) і аматарская (тыя, якія пакуль што гуляюць у кіно).

— Не павінна быць такога падзелу, бо не адзін аматар прафесійна працуе над фільмам, — кажа Кшыштаф.

Праўда, нам, студэнтам, крыху прасцей, бо маем асобы, якія падкажуць, можам карыстацца нашмат лепшымі прыладамі ў працы, але добры фільм гэта перш за ўсё ідэя.

Таму і варта хадзіць на такія фестывалі. Кароткі метраж дае сучаснаму чалавеку пачуццё, што кіно гэта яго свет: хутка мяняюцца тэмы, твары, наперамен смяешся ды апускаеш

Абвяшчэнне вынікаў

галаву. Як у калейдаскопе. Варта, аднак, звярнуць увагу, што таксама такія агляды паказваюць, якіх маем маладых людзей, чым яны цікавяцца, што іх турбуе, нават якімі людзьмі з'яўляюцца самі аўтары, бо кожны фільм паказвае частку асобы яго стваральніка.

— З ідэямі бывае па-рознаму,

— кажа Ірэкс. — Фільм, які мы паказвалі сёлета, зроблены на вялікім пахмеллі. Падняліся зранку і падумалі рабіць. Выходзіць так, што фільм больш акцёрскі, бо граю там найбольш тварам, але пэўна таму, што ў нас быў такі настрой.

Іншыя рабілі сваё кіно неабавязкова пасля вялікай імпрэзы. Паяўляліся сапраўды турбуючыя тэмы, напрыклад, насілле, пакаранне, боль пасля страты блізкіх, любоў, якая з'яўляецца вялікім выклікам. Самае цікавае, што такія вось фільмы і вылучыла журы. Можа і правільна, бо гэта паказвае, што само кіно бывае выклікам як для аўтара, так і для гледача. Самае важнае — выйсці з паказу і хацець яшчэ задумацца над зместам пабачанага фільма. Бывае, што няма чаго перадумваць, бо і фільмы абапіраюцца на просты сюжэт „забілі яго, а ён уцёк", або здымаюцца толькі дзеля гульні і смеху. Ага, забыла яшчэ, што сярод такіх фільмаў можам глядзець гэтак званыя „рамантычныя камедыі". Маладыя людзі прабуюць зрабіць чарговы крок у кінематаграфіі і гэта ім паспяхова ўдаецца.

Фестываль „ЗубрОФФка" гэта не толькі студэнты і аматары. Мае ён яшчэ пару іншых рысаў, пра якія патэнцыяльны наведвальнік павінен ведаць. Гэта перш за ўсё міжнародная частка. Агляд фільмаў з Усходняй Еўропы ды прыбалтыйскіх краін нясе з сабой дадатковыя вартасці. Справа нават не да канца ў якасці карцінак, а ў спосабе прадстаўлення свету аўтарскіх думак. Цяжка абсудзіць, у чым заключаецца прычына, што іхняе кіно зусім іншае. Прабуюць розных эксперыментаў, але з другога боку ступень рэфлексіі не адпавядае таму, што паказваюць маладыя польскія аўтары і творцы з іншых краін. Няхай прыкладам гэтаму будуць венгры, якія не баяцца цяжкіх выклікаў, а прытым дасканала валодаюць тэхнікай. На маю думку, міжнародны агляд „Акно на ўсход" паказаў, што

суседзі з Беларусі, Украіны ці Латвіі ўсё ж такі яшчэ дасцяваюць.

Праяўляецца гэта хаця б у пераліку тэм, дзе асноўнае месца займае іхняя філасофія жыцця, што момантамі складана зразумець, бо гэтая філасофія не заўсёды аказваецца ўніверсальнай тэмай. Цешыць аднак, што ўзнагароду агляду „Акно на ўсход" узяў фільм пра Гродна. У пэўным сэнсе была гэта даволі цяжкая задача, бо і тэма вельмі кранальная, а героі фільма гэта проста чалавечыя людзі. „Гродна — Новы свет" гэта аповесць пра стары раён горада, дзе сем'і жывуць у амаль стогадовых драўляных дамах. Дом з'яўляецца пэўным сімвалам, а трагедыяй аказваецца імкненне ўлад горада расправіцца са старымі дамамі і ўладзіць свой уласны Новы свет. Атрымалася карціна, якая паказвае людзей, іх сентымент, блізкасць, якая не з'яўляецца характэрнай рысай беларусаў.

— Я нанова адкрыў свой горад, — кажа Павал Міцкевіч, аўтар праекта, у рамках якога паўстаў фільм пра Гродна. — Самае важнае, што мы адкрылі і гэтых людзей, якія патрабавалі нас, не менш чым мы іх.

Праўда, героі фільма кожны дзень чакалі сваіх маладых гасцей, запрашалі паабедаць, крыўдзіліся за спазненні. Галоўнае, што на момант адчулі сябе важнымі.

— Фільм паказвалі ўжо двойчы ў Гродне, — дадае Павал, — нават адбыўся паказ у доме адной з гераінь фільма. Таксама адбыўся паказ у Вільні, дзе прыйшло шмат студэнтаў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Цікава мне было параўнаць рэакцыю віленскай ды беластоцкай публікі. У Вільні я ўпершыню адчуў такую прывязанасць да свайго, а студэнты перажывалі не менш за мяне.

Фільм паўстаў у рамках праекта „Моладзь у абароне еўрапейскай спадчыны" на сродкі нямецкай праграмы „Меморыя". Працавалі пры ім маладыя людзі з розных краін. Фільм з'яўляецца важным таксама таму, бо гэта эфект працы зусім розных асоб, якія ў кіно займаюцца размаітымі формамі, а таксама людзей, якія раней не мелі ніякага дачынення да фільма.

Перад „ЗубрОФФкай" яшчэ мноства працы,

каб стаць вялікім фестывалем. Але, як кажуць творцы фільмаў, у Беластоку спрыяе нейкая іншая атмасфера. Цудоўна было б, каб менавіта тут кіно адкрывалася на Усход і на Захад, а Беласток стаў адным з прыпынкаў на фестывальнай карце Польшчы. Хочацца, каб адрасатамі беластоцкіх аглядаў былі не толькі жыхары Беластока, але і наведвальнікі з усёй Польшчы, а дзякуючы міжнароднаму конкурсу — таксама з усёй Еўропы.

— Мы да гэтага рыхтуемся і неўзабаве будзем гатовыя, — кажа Мацей Рант, заснавальнік і галоўны арганізатар фестывалю.

Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Прададзены за моладу

— Тут мяжа мянялася што і раз, — кажа дзядзька Віталь. — А мы тут сядзім, гарэм. Віталь Казлоўскі — адзін з гаспадароў у вёсцы Ярылаўцы, пра якога варта напісаць кнігу, як пра вёсачку, што расселася пры самой беларускай мяжы ў Гарадоцкай гміне, на марэнавых узгорках. Трымаюцца яны, Казлоўскія і іншыя ярылаўчане, роднага, жывуць прыстойна гэтыя звычайныя моцныя, ушчапераныя ўсімі жыламі да роднай зямлі. Калі стануць такія як яны героямі рэпартажу ці апавядання — дык для падмацавання нашых душ.

А тут у перадзім'е вядзе мяне ў Ярылаўку адна бяда і герой не скажаш што геройскі. Такі, што пры свечцы сядзіць у паўразваленай палацовай мураванцы. Хата з дзевятнаццатага стагоддзя, увесь палацавы комплекс яшчэ ад XVIII, Валодзя Чыжэўскі жыве тут з дваццатага веку. У гэты марозны дзень у шапцы-аблавушцы бачу яго ранічкай, як у торбе з-пад цукру нясе яйкі. Зарабіў. Жыве ў доме, які прадала гміна разам з полем сыну былога сенатара, кажуць тут, што вялікаму багацею на ўсю Польшчу. Тут маёнтак калісьці быў. На пагорку — у парэштцы палацавага парку стаіць дамішча, з якога сыплецца тынк і трухлее мур, а ніжэй — былыя мураваныя стайні і шпіхеры. Ад вёскі дом, у якім жыве „дзедзіч" Чыжэўскі, адгароджваюць загоны, на якіх новы ўласнік расставіў вуллі. Летам Валодзя хадзіў увесь апухлы, зусім не ад гарэлкі — гэтак дабрадзеевы пчолы яго пакусалі.

Во як тут жывецца!

— Дабрадзей яго з хаты не выганяе, дазваляе яму тут жыць, — кажа Ян Камінскі, пісьменнік, які набыў хатку ў Ярылаўцы і закалегаваўся з тутэйшымі. Пан Ян таксама спрыяе Чыжэўскаму, бо пільнуе ён яго хатку, калі гаспадар у Беластоку. — Бо пільнуе пан Владэк і той чужы дом, іначай яго расцягнулі б па цагліне.

А хто расцягваў бы? У народзе нічога не марнуецца, што блага ляжыць. Хоць у Ярылаўцы людзі вельмі справядлівыя, чужога не возьмуць Але і свайго не аддадуць. Але пралятае побач шлях з усходу на захад, з захаду на ўсход — усюды навалачы поўна. Патузаюць нашых туды і сюды, а нашы і так вернуцца на сваё.

— Я нетутэйшы, — кажа Чыжэўскі і хавае чырвоныя рукі ў адвальваючуюся ад курткі кішэню. — Але па-нашаму навучыўся. Нарадзіўся ў Кентшыне. Бацькі „ў Прусы" паехалі за работай. Ды там не ўжыліся. Прывезлі мяне з сястрою сюды яшчэ малалеткам, самі ўладкаваліся ў пэгеэры ў Лужанах. Да смерці працавалі, пакуль пэгеэр не развалілі новыя ўлады. Тут, у гэтым палацы, і жылі мы ўсе. Мая мама была Дарашкевічанка, Марыся, з Коматаўцаў, а тата Коля з Крушынян. Спачатку жылі мы ў Коматаўцах, пасля рабілі ў Лужанах. Нашу хату лужанскі кааперытыў сам трымаў у арэндзе. Жылі мы тут бы ў сябе, ды і не ў сябе. Бацькі рабілі, рабілі, і да нічога не дарабіліся. Памерлі. А я тут у гэтым палацы, у палацовым парку і жыву адзін. Хат у Ярылаўцы з пятнаццаць, рэшта на хутарах. Людскія тут людзі — Казлоўскія, Шапелі, Севярыны, Цярэшкі...

Над маладым скрыпучым снегам трапечацца здрацянелае быллё. Карабкаемся па марэнавым узгорку, каб яшчэ не ў змроку дайсці да „палаца".

— Што? Жаніцца? Дзе ж у гэты ўзрост (нарадзіўся ў 1956 годзе). Ды якая пойдзе да голага, які жыве ў несваёй хаце? З падмацоўкай ад гміны адно? Адна ў мяне жывінка — коцік сляпы, Кубусь. Што, пра працу гаворыце? А дзе тут занятак знойдзеш? І са школай людзі працы не маюць. Мне тут пры нейкай нагодзе грош трапляецца — ці то пан Ян што падкіне, то пры рамонце нейкай хаты што зараблю. Звыкся перш за ўсё з людзьмі.

Хату асвятляе батарэйка майго мабільніка і бляск фаталямпы. Сапраўды — руіна. Разваленая кухонная печ. На прымерзлай і вільготнай сцяне — матчыны яшчэ кілімы, шлюбныя партрэты гожай пары, спаглядае мілавідны малады хлопец у вайсковай шапцы. Гэта сам Уладзімір Чыжэўскі. Скача на рукі гаспадару чорны коцік з бельмам на воку.

— Як тут жыць? Прапанаваў мне войт Гарадоцкай гміны памяшканне ў Баброўніках. Але ж я за свае грошы з рамонтам не спраўлюся. Абяцалі мне дапамагчы з гміннай камунальнай гаспадаркі, ды ўжо гады тры рамонт той робяць. Войт глядзіць на мяне як на назойлівую муху. Я ж не такі апошні, я ж чалавек, нямоглы. Я проста прашу дапамогі.

А што з электратокам? Паколькі перагніла адна сцяна, трэба было адключыць электрычнасць і перанесці лічыльнік на іншую. Адключылі. Пан Ян памог у пару соцень: трэба было купіць шмат метраў кабеля, памог электрык, правёў ток па здаравейшых сценах, ды каб зняць лічыльнік і перанесці яго, трэба мець ліцэнзію. А гэта і грошы.

Даведваемся пасля ў Беластоку. Каб пану Чыжэўскаму падключылі электраток да ягонага памяшкання, мусіць ён прыехаць у Электрычнае прадпрыемства з пасведчаннем аб праве на ўласнасць дома, прынамсі аб арэндзе, і падаць заяву на падлучэнне электратоку. Гэта каштуе 140 злотых. Калі ўсё будзе падрыхтавана да падлучэння, павінен прыехаць яшчэ раз і падпісаць дамову на дастаўку электратоку (500 зл.). А наступным чынам паклікаць электрыка з ліцэнзіяй, які яму легальна перанясе лічыльнік ды далучыць лінію да перасылачнага слупа. Гэта можа абысціся яму недзе яшчэ сама менш за тысячу. Адзін клопат — ва Уладзіміра Чыжэўскага няма ніякага дакумента на валоданне домам. Не мелі яго нават ягоныя бацькі, якія пражылі тут усё сваё спелае жыццё. Гарадоцкая гміна мела дачыненне да гэтай уласнасці да таго часу, пакуль не купіў яе разам з зямлёй польскі бізнесмен, які паяўляецца ў Ярылаўцы раз у год і невядома нікому дзе яго можна знайсці. Не выганяе ён кватаранта з развалiны, але і ён сам не інвестуе ў старажытныя „чваракі", і не дазваляе змяніць іх выгляд кватаранту. Усё ж — гэтая хата — частка палацовага комплексу!..

Сядзіць пры свечцы ў марозныя вечары ў сваёй аблавушцы прышэлец „з Прусаў", што навучыўся мовы сваіх бацькоў, і не мае да каго на гэтай мове прамовіць. Нават чорнага коціка ўжо ў яго няма.

Гайнаўка

Заахвочванне да творчасці

7 снежня г.г. у галерэі Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы адкрылі выстаўку XV Агляду непрафесійнага мастацтва Гайнаўскай зямлі. Агледзець можна найлепшыя працы 33 аўтараў. Яны — у розных пластычных тэхніках: жывапіс, рысунак, разьба і тканіна. Узровень мастацкіх прац з кожным годам вышэйшы!

Сёлета былі ўзнагароджаны працы Славаміра Рыбака, Мікалая Яноўскага, Юркі Жукоўскага, Данеля Грамацкага і Марка Сакоўскага (першыя ўзнагароды) ды Дзіяны Янчук, Януша Кулешы, Марка Тамашэўскага і Галіны Хітрук (другія ўзнагароды), а таксама Андрэя Боўтрыка, Магдалены Вайткоўскай і Кшыштафа Пабядынскага (трэція ўзнагароды). Вылучэнне за свае працы атрымалі мастакі-непрафесіяналы Малгажата Мруз, Тамара Кердалевіч, Баляслаў Гвоздзік, Матэвуш Рыбак, Казімір Храбалоўскі і Магдалена Галімская.

На выстаўцы разьбу па дрэве прадстаўляюць работы Паўла Хількевіча (першая ўзнагарода), Мечыслава Дудзіна, Мікалая Ягадніцкага і Мікалая Корха (вылучэнні); мастацкую тканіну — працы Эдыты Герасімюк ды батык — Барбары Плуг.

Арганізатар конкурсу — Гайнаўскі дом культуры заахвочвае непрафесіяналаў да мастацкай творчасці. Ужо пятнаццаць гадоў Агляд выяўляе новыя таленты і з'яўляецца пачаткам мастацкай дарогі гайнаўскіх прафесійных творцаў.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Чаромха

Будзем сур'ёзна вучыцца...

Калі на святкаваннях Дня дзіцяці размаўляў я з дырэктаркай Пачатковай школы ў Чаромсе Алінай Пліс, яна сказала, што з пачаткам навучальнага года павысіцца колькасць урокаў беларускай мовы. І слова стрымала. Пахадайнічала яна за тое, каб арганізаваць трэці клас. Зараз у школе родную мову вывучае 25 школьнікаў: у II класе — 7, у спалучаных класах IV-V — 6 і ў VI — 12 дзетак. На святкаванях Дня настаўніка малечы ўпершыню запрэзентавалі свае ўмеласці і дэкламавалі верш „Хутчэй бы ў школу". Ды і бацькі вучняў станоўча ставяцца да ўрокаў беларускай мовы. Сцяпан Нічыпарук, напрыклад, выступіў спонсарам экскурсіі вучняў IV-V класаў у Бельск-Падляшскі. Дзеткі наведалі піцэрыю і купальны басейн. Вярнуліся яны поўныя ўражанняў, пыталі ці яшчэ недзе паедуць. Але ім стала вядомым, што каб збыліся іхнія мары, трэба ім стрымаць адну ўмову — добра вучыцца. І яны аднадушна заявілі: „Будзем сур'ёзна вучыцца беларускай мове". Пра гэта расказала мне настаўніца беларускай мовы Альжбета Раманчук.

Уладзімір СІДАРУК

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Кацяняты ў лесе

Патрыцыя і Сяргей хуценька апрануліся. Дзеці паклікалі сабак і разам з бацькам пайшлі ў лес. Кожнай нядзелі, пасля абеду, яны хадзілі прагуляцца сярод соснаў і дубоў, што раслі непадалёк іх сялібы.

— Цікава, як мае мурашкі, — падумала ўголас Патрыцыя, — ці ўжо схаваліся пад зямлю?

— Не можа такога быць, — адказаў Сярожка, — яны ж яшчэ не развіталіся з табой!

Патрыцыя ведае ў сваім лесе кожны мурашнік.

— А чуеце, як грукаціць дзяцел? — не хацеў быць горшым Сярожка. — Цікава, ці яму ад гэтага дзюбак не спухне?

— А ў птушак бывае насмарк? — спытала дзяўчынка.

— Яны ж хварэюць на птушыны грып, — заявіў Сярожка — ну, памятаеце як калісь спалілі лебедзяў...

Сяргейка хацеў яшчэ сказаць нешта разумнае, але за плячыма пачуўся гул машыны. Нехта набліжаўся ў іх бок.

— Цікава, каго сюды нясе? — здзівіўся бацька.

У іх лес машыны заязджалі зрэдку, звычайна ў грыбны сезон. І зараз кампанія ў машыне не выглядала на грыбнікоў. Усярэдзіне выседжвала шчаслівая сямейка: бацька, маці, дзяўчынка і хлопчык. Здавалася, яны таксама выправіліся на прагулку... Незнаёмы адразу сказаў у чым справа:

— Дзядзька, зніміце сваім сабакам намордніки, — папрасіў у бацькі.

— А ў чым справа?

Бацьку не спадабаліся словы незнаёмага. Сабакі таксама пачалі брахаць.

— Я за хвілінку пушчу кацянят, а вашы цюцькі хай пагуляюць з імі. Ну, карацей, хай раздзяруць іх на месцы!

— Ну, ведаеце, — адказаў спакойна бацька, — я ніколі такога не рабіў і рабіць не буду!

Фота Ганны Кандрацюк

У беларускім садку

Ён зірнуў на кампанію ў машыне. Апрача шафёра ніхто не смяяўся. Дзеці глядзелі ўніз, маўчалі. Па шчацэ ў дзяўчынкі сцякала сляза...

Шафёр нешта фыркнуў і ад'ехаў з піскам. Праўда, ён спыніўся сто метраў далей і выкінуў кацянят праз акно...

Сярожка першы паспрабаваў нешта зрабіць. Ён схапіў сабак за ашыйнікі і з ўсёй сілы трымаў іх пры сабе. Добра, што кацяняты ўжо бачылі. Яны ўскараскаліся на елку і спазіралі на людзей спахлоханымі вачыма...

ЗОРКА

Міра ЛУКША

Кот з Катоўкі

Кот Мікіта непабрыты,
Бо яму так трэба.
А вусішчы ў Мікіты —
Для здабычы хлеба,
Хоць не жне ён таго жыта
І аўса не косіць,
Ды не скажаш пра Мікіту:
„Дарма вусы носіць!"
Гаспадар ката пахваліць
(Ён і сам вусаты!),
Піпку, сеўшы з ім, запаліць:
„Мы два — старой даты!"
Найлепшая гаспадарка
У нас ва ўсёй Катоўцы!
Ёсць гурочак, ёсць і скварка,
Каўбаскі ў кладоўцы...

Дзед Пятро і баба Маня
Пестуюць Мікіту.
Для Мікіткі ўжо з рання
На стале накрыта:
І смятана, і яешня,
І скрылёк каўбаскі...
Найважнейшая ж, канешне,
Не ежа, а ласка!
Як ні песці, усё ж — як тыгр!
Дзікі кот драпежны!
І прагоніць ён у міг
Ворагаў належна,
Ці то воўк, ці то мыш!
У Катоўцы — ціха!
Бо Мікіта пырсне: „К-к-кыш!!!"
І ўцячэ ўсё ліха!

Павел Шуканаў, 13 гадоў. Беларуская вёска.

Чаму ў бегемота вялікія складкі на скуры?

Было гэта вельмі даўно, тады, калі бегемоты маглі здымаць з сябе скуру, як пінжак. Зашпільвалася скура на тры гузікі на жываце. Але аднойчы з бегемотам адбыўся такі выпадак. А звалі гэтага бегемота Гуга. Гуга вельмі любіў усё салодкае, таму яго называлі Гуга-ласун. Побач з Гугам жыла малпачка Анфіса. Анфіса вельмі ўмела пячы смачныя караваі.

І вось неяк малпачка спякла прыгожы салодкі каравай. Паставіла яго на стол, каб астыў, а сама паскакала да сваёй сяброўкі. А Гуга пачуў смачны водар, падышоў да стала і з'еў увесь каравай. На сподачку засталіся толькі крошкі. Наеўшыся каравая, Гуга дабраўся да рэчкі, расшпіліў гузікі, скінуў сваю скуру і пачаў купацца.

Вярнулася дамоў малпачка Анфіса і ўбачыла, што няма пірага, а засталіся толькі крошкі. Яна адразу здагадалася, што пірог з'еў Гуга-ласун. Анфіса ўзяла сподак з крошкамі і паскакала на бераг рэчкі. На беразе яна ўбачыла скуру бегемота. Высыпала туды крошкі і вярнулася дамоў.

Калі Гугу надакучыла плаваць, ён вылез з вады і апрануў сваю скуру. Ды раптам зарагатаў, лёг і пачаў качацца па пяску і траве, бо пірожныя крошкі пачалі яго казытаць. І чым больш бегемот варушыўся, тым больш яго казыталі крошкі. Ён рагатаў да таго часу, пакуль не сцёр усе тры гузікі на сваім жываце. І не нацёр сабе вялікія складкі на скуры.

Сяргей ЧЫГРЫН

Зося з першага „а” класа

— 11 —

У дзень святога Мікалая, 19 снежня, у школе было шумна і весела. Усе захапляліся падарункамі, якія атрымалі ад сяброў.

Калі Янка Рыбачук пабачыў свой торт, ён так узрушыўся, што не мог сказаць слова.

— Ы... Зося! Гэта ж мой улюбёны торт ад Грышаня.

І дадаў: — На жаль, я не магу яго прыняць, гэта надта дарагі падарак!

— Тады я пакрыўджуся, — заявіла дзяўчына. — Мне будзе вельмі прыкра, што вы паганьбавалі маім падарункам.

— Ой! Не крыўдуй... — выхавацель праглынуў слінку. Ён крыху памаўчаў, падумаў, каб кінуць такую вось прапанову:

— Хіба, што пачастуем цэлы клас!

Усе вучні першага „а” класа, апрача Клары, захапіліся прапановай. Клара заўсёды трымала дыету. Увогуле гэта не быў яе шчаслівы дзень. Янка Рыбачук абдорыў яе беларускай кніжкай.

— Я не хачу такога гаўна! — плакала мадэлька. — Мне непатрэбныя такія дурныя кніжкі...

— Не хвалюйся, — суцяшаў яе Паўлік Пятрушэня, — Рыбачук не мае паняцця, што падабаецца такім дзяўчатам як ты!

— Які ты разумны?!— смяяліся з Паўла хлопцы. — Сам бы купіў ёй падарак. А то дурноты нейкія гародзіш!

Торт вельмі пасмакаваў выхавацелю і вучням. Ніхто не падумаў, што спёк яго Тамаш Вярбіцкі. Уся слава і пахвалы сплылі на майстра-кандытара Грышаня.

— Я ніколі не ела лепшага торта, — пахваліла Тамаша Зося. — Каб яшчэ Рыбачук згатаваў нам каву, тады было б як у раю.

— А я хачу, каб мы з табой пайшлі пасля ўрокаў папіць кавы, — сказаў Тамаш. — Давай сустрэнемся ў кандытарскай „Грышань”.

Зосі вельмі спадабалася прапанова. Яшчэ да сустрэчы яна зайшла ў кнігарню, каб набыць кулінарную кніжку для Тамаша. Яна хацела, каб хлапец развіваў свой талент. Там яна сустрэла свайго ворага з часоў дзіцячага садка. Паўл з Кларай заўзята сварыліся з касіршай. Жанчына не хацела вярнуць грошы за кніжку.

— Я ж не ведаю, — тлумачыла яна агрэсіўнай парачцы, — можа ваш выхавацель прынёс гэтую кніжку са сваёй хаты?!

— Гэта не так! — крыкнула Зося.

Яна ведала, што Рыбачук не быў такім прасцяком як Паўл Пятрушэня. Вось, яна атрымала ад Пятрушэні старую цацку-фігурку. Калі яе падарак пабачыў бацька, ён зморшчыў лоб і сказаў:

— Здаецца, такія самыя фігуркі вам падарылі на заканчэнне вучобы ў садку?!

— Ну, так, — уздыхнула дзяўчына.

Перад сустрэчай у кнігарні Зося думала, што Паўл Пятрушэня спецыяльна зрабіў ёй такі прыкольны сюрпрыз.

Тэкст: wodorotlenek92@wp.pl
Дызайн: majeszkorowu@tlen.pl

Вершы Віктара Шведа

Янка і санкі

Мама сварыць Яна,
Як з'явіўся дома:
— Не даеш ты санак
Браціку малому.

Запярэчыў Янка:
— Калі з'еду з горкі —
Зноў на горку санкі
Ўцягвае Ягорка.

Колькі гадкоў сыночку?

Кандуктар бацькоў
Запытаў у цягніку:
— Колькі гадкоў
Вашаму сынку?

Маленькі Аркадзь
Адказвае шчыра:
— Дома гадкоў пяць.
А ў цягніку чатыры.

Музыка з кайфам

Горкі на Каляды

Не ведаю ці ўяўляеце сабе, што можна на Каляды арганізаваць рок-фестываль. Большасць з вас напэўна не, але, шчыра кажучы, і я была крыху здзіўлена, калі пра тое даведалася. Аказваецца, што ў мясцовасці Горкі, зусім непадалёк ад Магілёва, студэнты ладзяць арыгінальны фестываль пад назвай „Рок-Каляды”!

Ідэя можа здацца дзіўнай, бо свята найчасцей праводзіцца ў сямейным крузе, а не на пляцоўках з рок-музыкай. Але, як паказвае вопыт, ёсць каму спяваць, ёсць каму і слухаць. Зусім небывалым з'яўляецца тое, што ў час фестывалю, 25 снежня, праводзіцца конкурсная частка. На другі фестывальны дзень адбываюцца канцэрты лаўрэатаў і зорак. А тых за сем гадоў паявілася сапраўды многа.

У першую чаргу на канцэрты запрашаюцца мясцовыя музычныя героі, а магілёўская сцэна ў гэтым плане даволі багатая. Напэўна помніце расповеды пра магілёўскі блюз, але побач яго квітнее таксама рок, рок-н-рол ці новая хваля эксперыментатараў. Да апошніх прылічым пэўна такія гурты як „Таварыш Маўзер” ці папулярныя ў гэтым сезоне ў Беларусі „Глюкі”. На горкаўскіх сцэнах, бо канцэртныя пляцоўкі з гадамі мяняліся, знайшлося месца для груп „Водар Сусвет”, „АШ”, „Глюкі”, „Акропаль”, „Каракулі”, „Гараж [104]”, „Eihel Straat”, „Всё и ничего”, „Сьцяг”, „Рок-ки” ці „Deviation” (прызнаюся, што ўсіх не ведаю, так як і не ведаю ўсіх гуртоў, якія рэпетуюць па беластоцкіх кропках). Таксама конкурснікаў паяўляецца шмат. Сёлета ў першы дзень інфармацыйнай кампаніі з'явілася пяць дэма-запісаў ахвотных прыняць удзел у конкурсе, што арганізатары лічаць вялікім поспехам. Цікава, што ў Горках журы стварае публіка і, мабыць, таму „Рок-Каляды” такія людскія ды блізкія слухачам.

— Чаму Каляды? — спыталася я ў арганізатараў. Адказалі, што гэта такі сяброўскі і поўны добрай энергіі час. Цяжка з гэтым не пагадзіцца. З другога боку большая частка жыхароў Беларусі адзначае Раждзяство ў студзені, таму не так цяжка сарганізавацца ў Горках. Галоўнае іграць так, каб слухачы не памерзлі і ахвотна вярнуліся праз год.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 51

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 47:

Меч, воля, вока, выданне, каханне, сода, табар, лады, ара. Маг, кол, вада, выхад, мода, кант, ванна, неба, ар, як, Юра.

Узнагароды, каляровыя алоўкі, выйгралі **Наталля Паскробка** з Нарвы, **Анна Аўксянцюк** з Чыжоў, **Юстына Вакулюк, Крыстыян Грушэўскі** з Арэшкава, **Пётр Герасімюк** з Гайнаўкі. Віншуем!



Калядныя апавяданні

Ніна БРУЧКО

1. Верачка

За акном гурбы снегу, марознае надвор'е. Нічога дзіўнага, пачатак студзеня. Яблынька, што пад кухонным акном у агародчыку, пакрылася, як святочная ёлачка, беллю і толькі галінкі трашчаць ад марозу.

Верачка, седзячы за столікам ля акна, з цікаўнасцю прыглядаецца птушачкам, якія грамадна весела свіргочуць, скачуць на самай верхавіне яблынькі.

— Хіба і яны цешацца, што праз два дні Каляда? — падумала з радасцю Верачка. Як добра, у школу ісці не трэба, ежы смачнай будзе ўдоваль і яшчэ прыхарошаная ёлачка ў кутку, самая краса! — Ой, сёння, або найпазней заўтра, мне ж ёлачку прыбраць трэба, а яна ж яшчэ расце ў лесе, і ланцужкі негатовыя, і крылы ў анёлкаў непамаляваныя, і пернікаў мама яшчэ не напякла, — жахнулася Верачка. У той момант у кухню ўвайшоў бацька і паклаў на стол пахучыя яблыкі-каштэлі, якія дастаў са скрынкі, што схаваная ў сене ў клуні.

— Татку! — ускрыкнула дачушка. — Трэба ехаць у лес па елачку, а гэтыя яблычкі — якраз будуць на яе аздобу!

— Добра, добра, Верачка, сёння пад вечар паедзем, толькі я нарэжу сечкі каровам на ўсе святочныя дні і закончу малацьбу апошніх кулікаў аўса, — адказаў бацька і, зняўшы шапку-вушанку і кажух, сеў за стол выпіць шклянку гарачай збожжавай кавы, якую толькі што заварыла мама. Тата, выпіўшы, адзеўся зноў і падаўся ў клуню. Мама пачала мясіць цеста на хлеб, каб на святочны дзень быў свежанькі. Старэйшая Верачына сястра, дарослая ўжо сястра Гандзя сядзела ў пакоі пад акном і канчала вязаць модную спадніцу з бардовых ваўняных нітак, каб новай пахваліцца перад сяброўкамі на арганізаванай у складчыну забаве. Бабуля і тая не сядзела без справы, з вялікай іголкай-грашоўкай у руцэ прышывала латку на зяцевых штанах-галіфэ. Азірнулася выкол сябе Верачка і крыкнула сама да сябе:

— Ну, мне таксама хопіць бяздзельнічаць, давай буду канчаць аздобы на ёлачку! — і хутка села за працу.

Вечарэла. Мароз мацнеў. Верачцы ўсё больш нецярплівілася. Ужо падрыхтавала кажушок і валёнкі, калі тата запрог кабылу ў сані і крыкнуў, адчыніўшы дзверы: „Ну, хутчэй апранайся, дзіцятка, едзем у лес!"

Ехалі моўчкі, каб не нахапацца вострага марознага паветра і, барані Божа, не захварэць на свята! Уехалі ў свой лес, вырубалі невялічкую, зграбную елачку і хутка, бо вёска была блізка лесу, вярнуліся дахаты. Неба асыпалі ўжо светлыя зорачкі, снег таямніча скрыпеў пад палазамі санак, з храпаў кабылкі бухала пара. Верачка ўзіралася ў неба і было ёй так весела на душы, што хацелася ехаць, ехаць, ехаць...

Поранкам абудзіла Верачку хатняя калатаніна. Мама і Гандзя бразгацелі кухонным посудам. Усе спяшаліся, вечар жа хутка прыйдзе і, як бач, як сядаць да калядняй вячэры. Верачка ўміг сарвалася з пасцелі і давай прыбіраць елачку. Сняданку ў гэты дзень ніхто не еў. Трэба ж чакаць зорку; нат старэнькая бабуля пасціла да вечара. Верачка павесіла бліскучыя ланцужкі вакол дрэўца, анёлкаў з рознакаляровымі крыльцамі, пернікі, яблычкі і цукеркі ў чырвоных паперках, на вяршку пасадзіла намаляванага сабою Дзеда Мароза, а галінкі асыпала кісцямі белай ваты. У хаце стала весела, святочна.

— Ну, Верачка, давай хутчэй круціць мак, бо мне трэба рыбу жарыць! — загадала мама. Верачка ўзлезла на цёплую хлебную печ, абхапіла паміж каленак верцяху і пачала круціць валком, а каб ніхто не заўважыў, ды што і раз лізнуць валок, бо кішкі ўжо марш ігралі. Сястра Гандзя занялася ляпеннем гаманаў. У другі дзень Руздва хлопцы прыйдуць па яе і забяруць на музыкі. Трэба тады абавязкова ўзяць з сабою міску гаманаў, а закусь і каўбаску ды яйкі закалядуюць у першы дзень свят...

За вокнамі ўсё больш цямнела. Калі маці з Гандзяй рыхтавалі вячэру, Верачка пільнавала першай зорачкі. У кутку пад іконай стаяў ужо бадзёры „дзед" скручаны бацькам з каласкоў сёлетняга ўраджаю, пад белым ільняным абруском пахацела сена, а на стале паяўляліся міскі з ежай: баршчом з грыбамі, куццёй з макам, сялёдкай у льняным жоўценькім алею, з цыбулькай, смажанай рыбай, сялёдкай у цесце, аўсяным кісялём, шчолакам з сушаных яблык і груш, булачкамі з макам.

— Ёсць, ёсць! — крыкнула Верачка: на небе міргала маленькая, ясная зорачка.

Уміг усе селі за стол. Бацька падзякаваў Богу за сёлетні ўраджай, пажадаў дачакаць у здароўі святачка на будучы год, усе перажагналіся і пачалі есці. Для Верачкі быў гэта самы прыемны момант пачынаючагася трохдзённага Руздва.

Па вячэры хутка ўсе леглі паспаць. У поўнач трэба ісці на ўсяночную, каб паслухаць прыгожых калядных песень. Верачка таксама з сяброўкамі ішла ў царкву, толькі намнога пазней. Пасля хацелася даўжэй паспаць, адпачыць, каб пад вечар пабегчы пад суседнія вокны пакалядаваць. Паспяваць без гвязды, закалядаваць грошыкаў на цукеркі, а потым доўга, доўга цешыцца святочнымі ўражаннямі.

II. Зноў з бацькамі

Раніца была халодная, за вокнамі ішоў густы, мокры снег. Ні капелькі марозу. Верка прачунлася раненька, глянула ў акно. Па вуліцы мчаліся машыны, тратуарам спяшаліся людзі ў прадуктовы магазін.

— Трэба спяшацца і мне, аўтобус не будзе чакаць, а бацькі — так, — прамільгнула думка ў Верчынай галаве. Паспешна апранулася, выпіла амаль адным глытком кубак гарбаты. Схапіла цяжкаватую ад прадуктаў сумку і паспела толькі гукнуць мужу перад самым выхадам: „Коля, я еду да бацькоў, вярнуся па Калядах, даглядай хату!" — і зачыніла за сабой дзверы.

— О, Верка прыехала! — крыкнуў на прывітанне ўцешаны бацька. З пакоя выглянула ахутаная мама і таксама задаволена ўсміхнулася. Гандзя акурат распальвала ў пліце. З-за печы выбеглі два коцікі-брацікі — белы і чорны — і весела паставілі хвосцікі, сталі церціся да Верчыных ног.

— Ты не распранайся, пасядзі крышку, вось зараз напалю ў печы, будзе цёпла, — кінула ў бок сястры Гандзя. — То ж мы праспалі, учора гатовіліся да позняга вечара, асталося нам, Верко, толькі напаліць у хлебнай печы, спячы макоўчыкі ды рыбу пасмажыць. Хлеб учора яшчэ купілі, хапіла ўсёй вёсцы. Некаторыя то і макоўчыкі бралі.

Неўзабаве ў кухні стала цёпла. Бацькі селі за стол, а Гандзя паставіла ім скромнае поснае снеданне.

— Бачыце, дзеткі, ужо мы не маем сілы чакаць зоркі, як калісь бывала, — сумна сказаў бацька, еўшы макароны з малаком. — І я, і маці, ужо слабенькія, ужо...

Паснедаўшы, бацька ўключыў тэлевізар, а мама зноў прылегла на канапу. Гандзя і Верка спрытна завіхаліся на кухні, толькі ніяк не ўтраплялі колькі спаліць дроў у печы, каб не спаліць булачак.

— Мамо, хадзіце сюды, падкажыце нам, хопіць ужо паліць? — паклікала маці Верка. Маці памаленьку, апіраючыся аб сцяноўку, падышла да печы і глянула.

— Дзецяткі, хопіць ужо, хопіць, бачыце, угары топка ўжо пабялела, значыць — гатова, — сказала маці, разгартаючы кацюбою жар. — Праз хвіліну ўстаўляйце бляхі!

Булачкі з макам і яблыкамі ўдаліся добра, смачныя, пахацелі на ўсю хату. Усе ўзялі па адной і пачалі смакаваць.

Вечар хутка прыбліжаўся. Сёстры здорава справіліся з працай. Апрача хатніх заняткаў, коцікаў ды курэй, нічога жывога не было. Мама і на падворак зімою не выходзіла, толькі баценька любіў пашпацыраваць ад клуні да вуліцы, хоць і так не ўбачыць было чалавека на двары. Адны суседзі адышлі, або старыя сядзелі за печкай, маладых — як на лякарства. Нат птушачкі, як калісьці, так грамадна не прыляталі ў стары садочак.

Неба было хмурнае, ды і так ніхто не шукаў зорачкі. Верка разаслала абрусок на стол і пачала насіць ежу: аўсяны кісель, грыбны боршч, сялёдку, смажаную траску-дорша, сялёдку ў цесце, шчолак з сушаных яблык і груш, куццю з макам і разынкамі, булачкі з макам. Селі ўчатырох за сталом, а Верка сказала: „Дзякую Табе, Божа, за ўсё што на стале і дай на другі год дачакаць Каляд усім нам у здароўі!"

Усе моўчкі перажагналіся і пачалі есці. Настала цішыня. Пад'еўшы, бацька сказаў: „Ну, дзяўчаткі, а цяпер давайце паспяваем калядныя песні, як наказвае традыцыя!" і зацягнуў: „Нова радасць стала, яко не бывала, звезда ясна і прэкрасна всей свет воссіяла..."

Зараз жа падхапілі Верка і Гандзя. У хаце зрабілася святочная атмасфера. Праспяваўшы пару песень, бацька прызнаўся: „Ну, хопіць, я ўжо стаміўся, узаўтра гарадскія дзетачкі прыйдуць паспяваць нам пад акно або ў хату, толькі песні не тыя, незнаёмыя, новыя, або папольску".

Бацька перажагнаўся, устаў ад стала і пайшоў у пакой спаць. Мама таксама ціха шмыганула ў сваю пасцель. Гандзя з Веркай прыбралі са стала стравы і моўчкі накіраваліся ў свой пакойчык. Ніхто нікуды не спяшаўся. На ўсяночную ідуць маладзейшыя жыхары. Або маладыя гарадскія ўнукі. Царква не набітая людзьмі, як бывала. Усе тры дні свята праляцелі хутка і ў цішыні.

III. У горадзе

Калядныя святы, як кажуць у народзе. Трэба спяшацца, гатовіцца, прыйдуць дзеці і ўнукі. А дванаццаць страў трэба нарыхтаваць абавязкова, а тут сілы ўжо не тыя... — пхаліся назойлівыя думкі ў галаву Веркі. Прысела ў фатэлі і пачала планаваць святочную падрыхтоўку: пайду ў магазін, куплю тое і тое, увару, спяку...

— Што так ціха сядзіш без справы? — вырваў яе з задумы Коля. — Пасляўтра Каляды, работы поўна, а ты сядзіш і аб чымсьці раздумваеш, — не адпускаў муж.

— Добра, ужо, добра, — кінула абыякава Верка, няспешна паднялася з фатэля і ўзялася за хатнія заняткі. Не паспела, як кажуць, аглянуцца, як надышла Каляда.

Дзень быў пахмурны, вакол чорны тратуар, нідзе і капелькі снегу не ўбачыць. Нічога не прыпамінала святочнага дня. Толькі за акном расцягнутыя ад дрэва да дрэва бліскацелі лямпачкі і велізарная постаць святога Мікалая з мехам на даху суседняга магазіна, а ў хаце маленькая ёлачка на тэлевізары паказвалі, што прыйшло Руздво. У Верчынай душы не адчуваліся ні святочны настрой, ні ахвота святкавання. Верка машынальна разаслала белы як снег абрус на вялікі стол і стала насіць талеркі з ежай. Па хаце разнёсся прыемны пах страў. Падрыхтаваўшы калядны стол і чакаючы гасцей, Верка стала перад балконным акном і пачала ўзірацца ў неба. Ніводнай зорачкі, усюды цёмна, толькі бляск развешаных наўкола лямпачак рассвятляў двор высачэзнага блока. Углядаючыся ў яркія аганькі, Верка адчула, што нібыта анёльскія крылы панеслі яе ў родную вёску. У бацькоўскую хату. І раптам Верка ўбачыла сябе за калядным сталом, у сваім родным доме, і ўсю сваю вялікую даўнюю сям'ю. Нат саламяны дзед у кутку на момант ёй прымроіўся. А яна, Верачка, як падростак сядзіць за сталом, маці гладзіць яе ласкава па галоўцы, радасна ўсміхаючыся, а бацька дастойна кроіць скібку за скібкай хлеб і кладзе кожнаму. За акном бела-бела, а на небе міргаюць ясныя зорачкі. Так ясна, так лёгка, так радасна...

Раптам пачула званок у дзверы і дарагая ёй карціна прапала.

— Ой, гэта, пэўна, дзеці, адчыняй, Коля, дзверы! — крыкнула Верка мужу. Дзверы адкрыліся і дочкі з мужамі і расшчабятанымі наймалодшымі ўнукамі ўваліліся ў калідор. Не чакаючы першай зоркі, расселіся за сталом на сваіх месцах, як заўсёды. Хаця ніхто сур'ёзна не чакаў да зоркі, то ўсе былі галодныя, асабліва малечы. Верка ўзяла падзеленую прасфору, паднесла кожнаму на талерцы. Усе ўзялі па кавалачку, выказалі святочныя пажаданні. Ніхто не ўглядаўся ў неба, не шукаў зоркі, а ўсе ўзяліся за ежу, якой быў на стале дастатак, асабліва рыбы. Усё поснае, як трэба, ды такое смачнае, смачнае...

— Крышку паелі, цяпер паслухаем „Ціхую ноч"... — сказаў, падрываючыся з крэсла, уключаючы магнітафон зяць Тамаш. Потым былі іншыя калядныя песні, якіх Верка не ведала. Усе маладыя весяліліся, Верка таксама ўсміхалася, толькі штосьці цяжкае ціснула ў сэрцы: „Чаму не ўмею цешыцца як калісьці; то ж уся сям'я за сталом, усе здаровыя, а я?.." І зноў думкі на анёльскіх крылах ляцяць у мінулае...

Найбольш радасных воклічаў — пры раздаванні падарункаў. Усе развіваюць, охкаюць і ахкаюць. Верцы таксама дасталася ад Мікалая нямала. Хваліла, дзякавала...

Вечар хутка мінуў, дзеці пайшлі наведаць другіх старых бацькоў. На падлозе валяліся ўпакоўкі з-пад прэзентаў, на стале — поўна посуду. Верка з Колем хутка справіліся і навялі парадак. Селі ў фатэлях адпачыць і Верка не вытрымала:

— Бач, Коленька, асталося нам толькі цешыцца дзяцьмі і святачкам, усё ў сям'і па-божаму ідзе, ды сэрца чагосьці трапечацца неспакойна... Што ж, жыццё бяжыць, а мо не бяжыць, а канкордам ляціць нам, асталіся мы з табою зноў адны, ды, дзякую Богу, пакуль мы двое. Каб і праз год святачка дачакаліся...

І Верка з Колем змоўклі, у хаце зрабілася ціха, толькі лямпачкі на маленькай ёлачцы весела міргалі.

Следам сваёй гаворкі

Міхал МІНЦЭВІЧ

У Орлі, дзе ўмовы спрыяюць захаванню тоеснасці, мясцовая гаворка гасне з пакалення на пакаленне. Дзеці і моладзь штораз менш пераймаюць тоеснасць сваіх продкаў і дабравольна асімілююцца і паланізуюцца; гэта трывожыць толькі нямногіх. Пацікавіўся я, чаму так дзеецца...

Як сам здаўна помню, хапала, каб у праваслаўных вёсках з'явіўся нехта чужы, то ўсе мясцовыя ў яго прысутнасці зразу стараліся гаварыць на польскай мове. Але паміж сабою гаварылі на мясцовай беларускай гаворцы, хаця да суседа-каталіка выпадала звяртацца па-польску.

Як успамінаюць старэйшыя жыхары, у арлянскай школе ў пасляваенныя гады вялося двайное навучанне — у г.зв. „польскіх" класах усе прадметы навучалі на польскай мове, а ў „беларускіх" класах на беларускай. І пасля, у сярэдніх школах, вучні з „беларускіх" класаў мелі цяжкасці з польскай мовай.

Большая частка нешматлікіх арлянскіх каталікоў гаварыла і гаворыць па-тутэйшаму; другая частка толькі па-польску. Апошнія разумеюць мясцовую гаворку, некаторыя з іх умеюць на ёй гаварыць, а іншыя тлумачаць, што прабавалі ёю карыстацца, але беспаспяхова; мясцовыя звяртаюцца да іх па-рознаму.

Больш дваццаці гадоў таму адна настаўніца прызналася мне, што мае клопат з вясковымі вучнямі пачатковых класаў, у якіх дома размаўлялі толькі па-свойму, бо яны добра не разумелі польскай мовы. Цяпер гэтай праблемы няма, бо дзяцей тадышніх першакласнікаў выхоўвалі ўжо на польскай мове.

Яшчэ не так даўно здзіўленне выклікаў факт, калі дзяцей у вясковых мешаных сужонствах выхоўвалі па-польску. Зараз здзіўляе, што ў праваслаўных сем'ях, дзе старэйшыя між сабой гавораць па-свойму, да дзяцей звяртаюцца толькі па-польску.

Пра нашы моўныя справы апытаў я жанчын у крамах, на вуліцы і ў школе...

Ірэна Нявінская, настаўніца беларускай мовы: — Калісь рэдактар Праховіч спытаў мяне, чаму падае зацікаўленне вывучаннем беларускай мовы. А я адказала: — Як можна прымусіць вучня да вывучання роднай мовы, калі яго бацькі саромяцца яе? Аб чым тут гаварыць?

Цешыць зацікаўленне вывучаннем роднай беларускай мовы ў арлянскай школе, якой урокі ў падставоўцы наведвае 109 вучняў (62,3% ад агульнай колькасці), а ў гімназіі 33 вучняў (42,86%). Дадам, што ў час апошняга перапісу насельніцтва 80% жыхароў Арлянскай гміны назвалі сябе беларусамі.

Як я разведаў, у Орлі вельмі рэдка можна пачуць свойскую гутарку паміж вучнямі. Адны саромяцца размаўляць, іншыя не хочуць каб калегі абзывалі іх „wieńniakami". Аднак, як я сам прыгадваю, дакукі былі заўсёды, нават тады, калі ўсе размаўлялі на сваёй гаворцы, бо яна ж крыху рознілася ў паасобных вёсках. Напрыклад, у Орлі, Міклашах, Вульцы і Крывятычах гаварылі „робіты", у Кашалях „робыты", а ў Шчытах „робіті". У той час маладыя людзі пазнавалі польскую мову толькі прыходзячы ў школу.

Фота Міры Лукшы

Ці вучні з Орлі захаваюць сваю гаворку ці поўнасцю асімілююцца? Ёсць пра што думаць

Не ўсе пажылыя людзі ўмелі размаўляць па-польску; гэта яшчэ відаць і сёння, калі, напрыклад, пажылыя людзі, асабліва з вёсак навокал Орлі, звяртаюцца да пані магістр фармацыі толькі на сваёй гаворцы. Калі я спытаў спадарыню Касю, якая там працуе, даязджаючы з Бельска, ці гэта ёй не клопат, пачуў адказ з усмешкай:

— To mi nie przeszkadza, już się nauczyłam.

Прыгадваецца мне адно здарэнне з 1980-х гадоў, калі да голасу дайшла „Салідарнасць". Вось адна чужая жанчына, якая шукала дапамогі ў мясцовай шаптухі, апынулася каля геэсаўскай крамы, дзе, пачуўшы мясцовую гаворку, адразу выбухла абурэннем і злосцю: „Po jakiemu rozmawiacie? Tu jest Polska!" Пра гэтае здарэнне людзі гаварылі яшчэ доўга.

Зараз у Орлі прадаўшчыцы выводзяцца з маладога і сярэдняга пакалення; вось што яны заўважылі.

— Да пакупнікоў звяртаемся пачаткова на польскай мове, — сказала адна, — бо не ўсіх ведаем, аднак і тутэйшыя найчасцей адзываюцца да нас па-польску.

— Я заўважыла, — сказала іншая, якая родам з суседняй гміны, — што людзі не любяць каталікоў, мабыць, маюць для гэтага нейкія падставы. У маёй гміне амаль усе праваслаўныя размаўлялі і размаўляюць на польскай мове. Цяпер у Орлі маладыя размаўляюць па-польску, але адчуваецца іхняя насцярожанасць да іншых, недавер.

Вось так — маладыя падсвядома адчуваюць сваю іншасць, але адначасна самі хочуць быць тымі іншымі.

— Калісь, — сказала іншая прадаўшчыца, — наша сям'я гасцявала ў Бельску і маё дзіця адазвалася за сталом па-свойму — „я хочу". Тады гаспадыня адразу звярнула ўвагу: „Jak ty rozmawiasz? Trzeba mówić ja chcę". Стала нам вельмі прыкра і з таго часу выхоўваю дзяцей па-польску. Але сваю гаворку яны ведаюць, ад бабуляў, якія размаўляюць па-свойму.

— Ці ў маёй вёсцы дзеці размаўляюць па-свойму? — перапытала мяне іншая прадаўшчыца. — А хто ж мае размаўляць, калі няма маладых сужонстваў і няма дзяцей. Тут, у Орлі, калі нарадзіліся мне дзеці, размаўляю з імі па-польску. Але яны сваю гаворку ведаюць, бо мы з мужам гутарым паміж сабою па-свойму. І бабулі таксама так гавораць. Дзеці самі навучыліся нашай гаворкі, разумеюць яе, умеюць на ёй гаварыць, але не карыстаюцца ёю — гэтаксама як і іх равеснікі.

— Мая цешча не ўмее складна гаварыць па-польску, — сказала адна з пакупніц. — То я ёй кажу, каб нават не прабавала, бо гэта недарэчна атрымліваецца; прашу, каб гаварыла толькі па-свойму.

— А мая цешча адазвалася па-свойму да ўнука, значыць да майго сынка, вучня падставоўкі, — расказвае чарговая пакупніца, — бо жывём з ёю ў адной хаце. Той адрэагаваў з абурэннем: „Jak Ty do mnie się odzywasz!" Самае цікавае, сын вывучае ў школе беларускую мову, а мясцовай гароркі не хоча слухаць. Я сама гэтага не разумею чаму так ёсць.

І мне, ураджэнцу Орлі, цяжка гэта зразумець; гавару пра гэта з людзьмі. Некаторыя бацькі неахвотна гавораць пра гэта, крыху спасылаюцца на палітыку, на адсутнасць у краіне сімпатыі да ўсходняга замежжа. Іншыя бацькі кажуць, што сваіх дзяцей выхавалі на роднай гаворцы, дзеці яе добра засвоілі, але з часам перасталі на ёй размаўляць і цяпер карыстаюцца толькі польскай мовай. А гэта прымушае і бацькоў гаварыць па-польску.

Жанчыны закранаюць яшчэ іншую моўную праблему. Яны занепакоены, што ў царкву прыходзіць штораз менш вернікаў. Чаму не ідуць у царкву людзі пажылыя, гэта наогул вядома: няма ўжо ў іх здароўя, каб дайсці ў храм і там выстаяць. Але маладыя не ідуць у царкву, бо мова набажэнства ім незразумелая і іх там прысутнасць траціць сэнс. Жанчыны таксама наракалі, што няма дзе прысесці, бо лаўкі займаюць старэйшыя, а выходзіць у часе службы непрыстойна. Я мяркую, што калі Царкве будзе важная прысутнасць, то яна адкліцца на патрэбы вернікаў.

Пры нагодзе прыгадалася мне адна падзея, пра якую расказаў мне адзін рабочы з сямятыцкай фірмы, якая зараз пракладае каналізацыю ў Орлі. Вось у адным з прыходаў у Сямятыцкім павеце бацюшка адмовіў маладому сужонству ахрысціць дзіця, спасылаючыся на тое, што яны не наведвалі сваёй царквы. Маладыя тлумачылі, што пражываюць у Варшаве, але ахрысціць хацелі б у бацькоўскім прыходзе. Аднак бацюшка не згадзіўся і маладыя паехалі ў Варшаву, дзе іхняе дзіця ахрысціў сам мітрапаліт Сава.

Вяртаючыся да тэмы замірання сваёй гаворкі, хачу заўважыць, што ўхілянне ад яе пачалося даўно, нават сорак гадоў таму, а здаралася гэта ў любоўных адносінах. Вось спытаў я жанчын старэйшага і сярэдняга ўзросту, бо яны смялейшыя і больш адкрытыя ў гэтых справах, на якой мове выказвалі яны свае пачуцці. І аказалася, што амаль усе рабілі гэта па-польску: „kocham". На маё пытанне, чаму гэта так у іх атрымлівалася, адказвалі: „Бо па-свойму гэта неяк дзіўна і сарамліва". Калі так было, то трэба сумнявацца, ці тыя словы былі шчырыя...

Варта пацікавіцца, што дзеецца са сваёй гаворкай, калі чалавек апынецца далёка ад родных мясцін; як родная гаворка праяўляецца, напрыклад, у снах. У маім жыцці быў такі перыяд, калі давялося жыць на Шлёнску. І вось там, на працягу некалькіх месяцаў, сны сніліся мне толькі на сваёй гаворцы, а пасля ўжо толькі па-польску. Мяркую, што ў снах чалавеку з'яўляецца тая гаворка, якою ён карыстаецца — калі перастае яе ўжываць на яве, яна знікае і ў снах.

Але калі мова занікае ў снах, гэта яшчэ не абазначае, што яна знікае з галавы; вядома, калі чалавек тужыць па родным. Вось сёлета расказваў мне Яраслаў Адзіевіч, пажылы жыхар Орлі, як здзівіла яго былая аднасяльчанка. На могілках падышла да яго Івона Вэйс, якая здаўна жыве на Шлёнску, і пачала размаўляць па-свойму. А яна ж яшчэ не старая, да таго ж з каталіцкага дому, але вырастала на мясцовай гаворцы і ёй было вельмі каштоўна пагутарыць на роднай мове. Яна сказала: „Калі да мяне тэлефануе зяць, а ён католік, то заўсёды пачынае на ламанай рускай мове; і гэта вельмі мяне радуе. А вось сестрын муж — ён таксама са Шлёнска — калі тут у гасцях крыху падпіў, то стаў абурацца на мясцовых субяседнікаў, што ўвесь час размаўлялі па-тутэйшаму".

Ад адной пажылой жанчыны пачуў я і наступнае: „Мая дачка выйшла замуж, маладыя пакінулі Орлю, пражылі згодна больш дваццаці гадоў, але нядаўна адзін зяцеў сямейнік дакорыў яму: — To ty z ruską żyjesz?!"

Свет мяняецца, а людзі гэтыя змены ацэньваюць па-рознаму. Калі свая гаворка занікае, людзям старэйшага пакалення здаецца, што яны, не выязджаючы, апынуліся на чужыне. Можна меркаваць, што за паўстагоддзя сваёй гаворкі ў Орлі не пачуеш зусім. Пра свае карані можа і неахвота помніць, але замазаць праўду пра іх, здаецца, будзе немагчыма.

Беласточчына Сяргея Чыгрына

Па добраму не перастаю здзіўляцца творчай актыўнасці і працаздольнасці слонімскага публіцыста і краязнаўца-даследчыка Сяргея Чыгрына. У адрозненне ад многіх нашых творцаў, адны з якіх пішуць „у стол", а іншыя папросту гультаі, Сяргей нібы задаўся мэтай выдаваць у свет не меней чым кніжку за год. І планку вызначанага трымае ўпэўнена высока, стала прэзентуючы чытачу нешта новае.

Чарговая кніжка Сяргея Чыгрына „Беларуская Беласточчына", што выйшла сёлета ў сталіцы Беларусі ў выдавецтве „Кнігазбор", бясспрэчна парадуе аматара айчыннай гісторыі па абодва бакі існай на сёння беларуска-польскай мяжы. Гісторыка-краяўнаўчыя і літаратурныя артыкулы Чыгрына, сабраныя на гэты раз пад адну вокладку, і расказваюць найперш пра знакамітых і выдатных беларусаў, якія нарадзіліся альбо жыццёвым лёсам наўпрост былі знітаваныя з Беласточчынай. Аўтар прадмовы да зборніка Віталь Луба слушна адзначае, што беларускі рух на Беласточчыне пачаўся фактычна ў другой палове дзевятнаццатага стагоддзя, калі ў гэтай старонцы за два гады да нацыянальна-вызвольнага паўстання 1863 году выдавалася нелегальная „Гутарка двух суседаў". Адсюль уласна можна адлічваць пачаткі рэгіянальнага беларускага нацыянальнага і літаратурнага руху. За паўтары стагоддзя Беласточчына дала беларускай культуры і гісторыі дзесяткі выдатных дзеячаў і творцаў. Імёны пераважнай бальшыні з іх да нядаўняга часу былі забытыя, нязнаныя альбо свядома замоўчваліся праваднікамі ідэалогіі антыбеларускіх палітычных рэжымаў. Язэп Варонка, Станіслаў Грынкевіч, Язэп Дашута, Хведар Ільяшэвіч, Янка Геніюш, Уладыслаў Чаржынскі, Янка Чарапук, Мікола Дзямідаў, Пятрусь Макаль, Аляксей Карпюк — пра іх і многіх іншых, вылучаных асоб, няпросты, а часам і трагічны лёс беларускіх змагароў, святароў, творцаў, апавядаецца ў выданні „Беларуская Беласточчына". Некаторым з ураджэнцаў Беласточчыны, пакінуўшым родныя мясціны яшчэ ў юнацтве, так і не давялося болей вярнуцца дамоў. Прыкладам лёс літаратуразнаўца і педагога Уладыслава Чаржынскага, які ў 1930 годзе быў арыштаваны ДПУ БССР па так званай справе „Саюза вызвалення Беларусі". Усё яго далейшае жыццё ажно да смерці ў 1998 годзе прайшло ў далёкім і чужым Татарстане.

Новая кніжка Сяргея Чыгрына змяшчае малавядомыя альбо зусім неасветленыя раней старонкі біяграфій, удакладняе многія ранейшыя моманты і спрэчнасці. Расказвае таксама пра беларускія грамадскія арганізацыі і творчыя калектывы. Прыкладам, легендарнае Таварыства беларускай школы, гурток якога быў створаны ў Беластоку ў 1927 годзе. Арганізацыя актыўна дзейнічала найперш у культурна-асветніцкім кірунку і праіснавала ажно да 1935 года, калі была зачынена мясцовай уладай. А, скажам, пра беларускі тэатральны кааператыў „Полымя" нават бальшыня з дасведчаных і заангажаваных чытачоў даведаецца ўпершыню. Звяртаецца аўтар і да культурніцкіх, найперш тэатральных (паколькі сам ён тэатразнаўца і да сёння працуе загадчыкам літаратурнай часткі Слонімскага драматычнага тэатра) сувязей Беластока з гарадамі сённяшняй Беларусі. Упершыню ў друкаваным кніжным выданні змешчаны аналіз адлюстравання культурна-літаратурнай Гарадзеншчыны на старонках тыднёвіка „Ніва", а з іншага боку творчасць беларускіх пісьменнікаў Польшчы на старонках мінскага часопіса „Роднае слова". Звяртаецца аўтар кніжкі, які пачаў друкавацца ў „Ніве" яшчэ ў далёкім 1984 годзе, і да персон сённяшняга дня, расказвае пра тых, хто жыве сёння ў Беларусі ці Польшчы — пра Арсеня Лабовіча, Іраіду Царук (Прытыцкую), Яўгена Міклашэўскага, Віктара Шведа, Мікалая Несцярэўскага. Усяго ў кнігу ўкладзены больш пяцідзесяці нарысаў, якія чытаюцца досыць хутка і змяшчаюць многа цікавай фактуры.

Неўзабаве на свет павінна з'явіцца яшчэ адна кніжка Сяргея Чыгрына. Яе, а таксама „Беларускую Беласточчыну" можна прыдбаць непасрэдна ў рэдакцыі „Нівы", на старонках якой раней былі надрукаваны многія даследаванні аўтара са Слоніма.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Шчодрыца

У беларускім сеціве не надта многа сайтаў, прысвечаных фальклорным музычным калектывам. І гэта нягледзячы на тое, што колькасць такіх калектываў не малая — працуюць яны ў кожным больш-менш буйным горадзе.

Існуюць нават такія фальклорныя ансамблі ў асобных частках буйных гарадоў. Як прыклад — „Шчодрыца", што ў квартале Лошыца сталічнага Мінска. Менавіта да гэтага ансамбля, дакладней да яго сайта ў інтэрнэце, мы сёння і завітаем.

Сайт ансамбля з такой сапраўды беларускай назвай месціцца па адрасе http://scodryca.info. Выглядае ён даволі арыгінальна, але разам з тым сціпла. Арыгінальнасць заключаецца ў пабудове выяўлення — сайт падзелены на дзве часткі, прычым выйсці да рубрык месціцца з правага боку, а асноўны тэкст, што займае большую плошчу — злева.

Галоўную старонку, на якой пераважаюць белыя і блакітныя таны, аздабляе вянок з валошак, здымак ансамбля і запрашэнне наведаць інтэрнэт-старонку. Такая простая падача нават прыцягвае і выклікае жаданне зайсці ў іншыя рубрыкі. А рубрык, дарэчы, нямнога. Цікава, што на сайце „рубрыкі" і „старонкі" чамусьці падзеленыя, але ў чым іх прынцыповае адрозненне між сабой — зразумець вельмі цяжка.

На старонцы „Пра «Шчодрыцу»" ідзе расповед пра даны калектыў, прычым робіцца гэта на крыху дзіўнай беларускай мове. „Фальклорны ансамбль «Шчодрыца» берэт свой назоў ад старажытнага беларускага свята «Шчадрэц», «Шчодры вечар», «Шчодра», у дзень імпрэзы якога ён быў і створаны ў 1994 году, — пішуць стваральнікі сайта. — У яго складзе студэнты вышэйшых вучэбных устаноў і прафесійных вучэльняў горада Менска. У рэпертуары калектыва адлюстравана багатая і разнастайная песенная і музычная спадчына беларускага народа. Ансамбль выкарыстае песні, музыку і танцы Цэнтральнага, Заходняга і Паўднёвага рэгіёнаў Беларусі".

Таксама тут мы даведаемся, што ансамбль неаднаразова быў узнагароджаны званнем лаўрэата розных фестываляў, а геаграфія ягоных выступленняў сягае ажно да Італіі.

Рубрыкі „Рэпертуар" і „Фотаздымкі" падводзяць, так бы мовіць, доказы творчай дзейнасці „Шчодрыцы". У „Рэпертуары" змешчаны гукавыя файлы выконваных ансамблем песень. Праўда, пакуль усяго толькі тры. „Фотаздымкі" больш багатыя на інфармацыю. Тут мы можам пабачыць як выступаў музычны калектыў на розных фестывалях. Прычым фотаздымкі могуць змяняцца аўтаматычна — як слайды.

Па ўсім відаць, сайт „Шчодрыцы" з'явіўся ў Байнэце зусім нядаўна. Але ягоныя стваральнікі паклапаціліся аб тым, каб з тварэннем іх рук змаглі пазнаёміцца не толькі тыя, што разумеюць па-беларуску. Сайт калектыву мае таксама рускую і англійскую версіі, якія раўназначныя паміж сабой.

Ёсць на сайце і рубрыка „Спасылкі". Пакуль яна зусім невялікая — там месціцца ўсяго толькі адно выйсце да сайта этна-гурту „Гуда", пра які „Ніва" пісала ў нумары ад 23 лістапада гэтага года.

Ну а калі камусьці захочацца звязацца з кіраўніцтвам ансамбля, то ўсе патрэбныя кантакты ён знойдзе на старонцы „Сувязь" і паразмаўляе з людзьмі, якія са свайго сайта заклікаюць нас „шчодра дарыць і багата жыць".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

СПОРТ

На розных франтах

На розных еўрапейскіх франтах выступалі апошні тыдзень беларускія каманды па гульнёвых відах спорту. Барысаўскі БАТЭ годна завяршыў свой першы (будзем верыць, не апошні!) у гісторыі выступ у асноўнай сетцы футбольнай Лігі чэмпіёнаў. Знешне барысаўцы падчас свайго дэбюту не зрабілі нічога асаблівага — набралі толькі (з іншага боку можна сказаць ажно) тры ачкі ў шасці гульнях, занялі ў групе апошняе чацвёртае (прагназаванае) месца. Але за сухой і, здавалася, бязлітаснай статыстыкай, хаваецца куды большае. БАТЭ Анатоля Капскага, якога ўжо можна прызнаваць чалавекам года ў беларускім спорце, зламаў звыклыя ментальныя стэрэатыпы і даказаў, што беларусы здольныя на большае, чым ім адводзіцца. Апошні матч БАТЭ згуляў унічыю 0:0 з пераможцам групы „Ювентусам" і такім чынам ні разу не саступіў турынцам (у Мінску было 2:2). Паспрыяў БАТЭ і вылету з розыгрышу Лігі пецярбургскага „Зеніта", які стаўся каліфам на гадзіну.

Жаночая гандбольная дружына, пра поспех якой расказвалася ў мінулым нумары, на другім этапе кантынентальнага першынства згуляла тры нераўназначныя матчы. Спярша была дзіўная гульня „без брамак" з харваткамі. Закінуўшы ў сетку саперніц ажно 35 мячыкаў, беларускі „злаўчыліся" прапусціць у сваю ажно 43. Лепшы матч у атацы і горшы ў абароне зразумела радасці не прынёс. Пасля адбылася гістарычная нічыя з нямецкай дружынай — адным з фаварытаў першынства — 28:28. І зноў, як і ў рандэву са шведкамі, беларускам крыху забракла добрага нахабства і ўдачы. А вось апошні паядынак з македонкамі — сваімі даўнімі крыўдзіцелькамі — нашы дзяўчаты праваліліі. Гульнёвага запалу і духу хапіла толькі на пачатак спаткання, пасля чаго нашы „пасыпаліся". У выніку 12-е месца на першынстве кантынента. Чэмпіёнкамі ж сталі нарвежкі, якія ў фінале адолелі іспанак. Днямі стала вядома, што ў накаўт-раўндзе гандбольнага чэмпіянату свету 2009 года Беларусь сустрэнецца з Румыніяй.

Айчынныя валейбольныя клубы працягваюць выступаць у еўракубках. Пачатак зімовай сесіі прынёс дваістыя пачуцці. Абедзве беларускія жаночыя каманды саступілі ў першых матчах. Мінулагодні чэмпіён краіны баранавіцкі „Атлант", які перажывае зараз не лепшы час, прайграў у 1/8 Кубка ЕКВ на сваёй пляцоўцы моцнаму стамбульскаму „Фенербахчэ" — 1:3. У складзе турэцкай каманды спрэс дасведчаныя легіянеркі, у тым ліку і нападніца зборнай Беларусі Марына Тумас. Так што спадзявацца на поспех „Атланта" па суме дзвюх гульняў цяпер могуць толькі непапраўныя аптымісты. Пацярпелі паразу ў першым спатканні 1/16 Кубка выкліку і дзяўчаты магілёўскага „Камунальніка". Але гэтае фіяска мела іншае адценне. У Бухарэсце беларусак сустрэла не толькі мясцовае „Дынама", але і традыцыйная румынская „гасціннасць" плюс неаб'ектыўнасць македонскага рэферы. У выніку тыя ж 1:3, але думаецца, што ў Магілёве айсберг можа перавярнуцца і выхаванкі Віктара Ганчарова, дарэчы лідары бягучага чэмпіянату краіны, здолеюць узяць годны рэванш.

Хто зноў сапраўды парадаваў — дык гэта валейбольны жлобінскі „Металург". Хлопцы Ігара Загорцава ў 1/16 Кубка выкліку таксама воляй лёсу трапілі на румынаў — клуб „Пятра-Нямц" з аднайменнага горада. Сустрэча ў гасцях прынесла вікторыю беларусам — 3:2. Палова справы была зроблена, а 16 снежня адбыўся другі матч, які расставіў усе кропкі над „і".

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Пабываць у Белавежы і зубра не пабачыць...

... гэтага проста не можа быць. А дзе найхутчэй паназіраеш за лясным волатам, як не ў Паказным запаведніку зуброў Белавежскага нацыянальнага парку? Таму ж запаведнік і з'яўляецца найбольш папулярным, дык найчасцей наведваным турыстычным аб'ектам Белавежскай пушчы. Зараз штогод пераходзіць праз яго каля 140 тысяч чалавек з усяго свету. Запаведнік адначасова выконвае адукацыйную ролю для школьнай моладзі, якая прыязджае ў Белавежу.

Паказны звярынец размясціўся ў 425 квартале пушчы, непадалёку ад шашы Гайнаўка — Белавежа. Падлягае ён непасрэдна Асяродку зубрагадоўлі БНП, які ўзначальвае Ежы Дацкевіч. Шэфам жа самога запаведніка з'яўляецца Аляксандр Вашкевіч, які ў лютым будучага года адыходзіць ужо на ранейшую пенсію.

У паказны запаведнік можна дабрацца на аўтамашыне, з'язджаючы, каля 3 км перад Белавежай, з шашы на лясную дарогу (налева). У гэтым месцы стаіць адпаведны ўказальнік. Пехатой найлепш і найцікавей дабрацца па лясной дарозе, па якой вядзе жоўты турыстычны шлях (уваход на шлях з Белавежы — зараз жа за домам пуцявога абходчыка, на правым баку шашы) або кладкай „Рэбры зубра" (уваход на шлях — некалькі дзесяткаў метраў за апошнімі дамамі Заставы, на левым баку шашы з Белавежы ў Пагарэльцы).

Запаведнік у сезоне (з 15 красавіка па 15 кастрычніка) працуе штодзень з 9 да 17 гадзіны, пасля сезона — з аўторка па нядзелю з 8 да 16 гадзіны. Можна яго наведваць індывідуальна, без экскурсавода (побач кожнай вальеры расстаўлены інфармацыйныя стэнды) або з экскурсаводам, нанятым у выбраным мясцовым турыстычным бюро. У 1967-1971 гадах турабслугоўванне забяспечвалася беластоцкім аддзелам Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства, затым Бюро абслугоўвання турыстычнага руху ПТКТ у Белавежы.

У запаведніку паказваецца, ва ўмовах набліжаных да натуральных, найбольш характэрная Белавежскай пушчы жывёла, значыць — зубры, тарпанападобныя конікі, ласі, алені, сарны, дзікі, зуброні (скрыжаванне зубра з каровай), ваўкі і рысі.

Спаглядаючы ў глыб гісторыі — зуброў пачаткова можна было аглядаць у звярынцы, збудаваным у 1929 годзе, з думкай аб рэстытуцыі гэтага віду. У той перыяд на свеце аставалася пры жыцці няшмат ужо зуброў, а ў Белавежскай пушчы ў 1919 годзе вынішчылі іх цалкам. Пачынаючы з верасня 1929 года пачалі сцягваць у Белавежу зуброў з заапаркаў і звярынцаў, якія знаходзіліся ў розных краінах.

Звярынец у Белавежскай пушчы размясцілі побач дарогі, якая спалучае Белавежу з Гайнаўкай (у 420 квартале). Займаў ён паверхню 22 га і быў раздзелены на тры вальеры.

У адной малой вальеры змешчаны былі паказныя зубры. Турысты маглі аглядаць іх са спецыяльнай трыбуны. Звярынец абгарадзілі плотам 2-метровай вышыні з 3-цалёвых брусоў, забяспечаным згары двума радамі калючага дроту. У 1932 годзе звярынец пашырылі на 421 квартал, дабудоўваючы да яго вялікую, ахоплівае 37 гектараў вальеру, прызначаную для чыстакроўна белавежскіх зуброў. Да восені 1932 года наведваючыя ўваходзілі непасрэдна ў звярынец і шукалі ў ім зуброў. Для людзей было гэта небяспечна. Каб пазбегнуць магчымых выпадкаў і запэўніць зубрам спакой, турыстам пастаўлена была спецыяльная трыбуна, з якой можна было свабодна аглядаць жывёлу па прасторнай паляне.

Вайна 1939 года застала ў Белавежы 16 зуброў. Ваенныя дзеянні, на шчасце, не прычыніліся да змяншэння белавежскага статка — у канцы 1944 года ў звярынцы знаходзілася 17 зуброў. Зараз жа пасля вызвалення зубры атрымалі карпатлівую апеку і зубрагадоўля ізноў пачала нармальна функцыянаваць.

З мэтай стварэння лепшых умоў для зубрагадоўлі сталі будаваць новы запаведнік, які быў здадзены ў карыстанне напрыканцы 1946 года. Новазбудаваны запаведнік плошчай у 123 га межаваў непасрэдна са старым. Іх супольная плошча склала 203,23 га.

Паспяховае развіццё зубрагадоўлі ў Белавежы пасля II сусветнай вайны дазволіла прыступіць да стварэння свабоднай гадоўлі пушчанскіх волатаў. У польскай частцы Белавежскай пушчы першыя зубры выпушчаны былі на свабоду ў 1952 годзе, а першае цяля на свабодзе нарадзілася ў 1957 годзе.

Цяперашні паказны запаведнік зуброў створаны быў у 1936 годзе на паверхні 27,90 га, пачаткова як месца рэстытуцыі лясного тарпана. З моманту, калі ў гэтым запаведніку працы над рэстытуцыяй тарпана былі спынены і ў 1955 годзе была створана вальера для зуброў, запаведнік пачаў выконваць ролю турыстычнага аб'екта. Раней, бо ў 1951 годзе, дабудавалі да яго новую вальеру плошчай у 43,12 га, якая з'яўляецца яго тылам. Паказны запаведнік агароджаны плотам, унутры раздзелены на 15 вальер.

Функцыянаванне запаведніка на амаль 16 год спыніў капітальны рамонт. У выніку праведзеных работ аб'ект быў мадэрнізаваны, што дазволіла пашырыць відавы састаў прапанаванай у ім жывёлы. На час рамонту, ад студзеня 1972 года, арганізаваны быў часовы паказны запаведнік у вальерах жывёлагадоўчага запаведніка № 1. Адрамантаваны і мадэрнізаваны запаведнік ізноў быў здадзены ў карыстанне турыстам у снежні 1987 года. 10 снежня 1987 года змешчаны былі ў ім зубры і тарпанападобныя конікі, у сакавіку наступнага года — алені, а ў лістападзе — ласі і сарны. У 1989 годзе запаведнік падмацавалі дзікі і зуброні. У снежні 1997 года дайшлі ваўкі, а ў студзені 2007 года — рысі.

Праўда, рэдка здараецца, але часам запаведнік — у сувязі з пагрозай яшчурам — для наведвальнікаў часова зачыняецца. Гэтак здарылася, м.інш., у 1960 і 1973 гадах. Варта затым перад планаваным візітам у запаведнік упэўніцца ці ён даступны, тэлефануючы на нумар (085) 68 12 398.

Пры нагодзе варта адзначыць, што Белавежскі нацыянальны парк у будучым годзе будзе ўрачыста святкаваць васімідзесятую гадавіну вяртання зуброў у Белавежскую пушчу.

Пётр БАЙКО

Як Сеня стаў сексотам

Нядаўна, будучы ў Беластоку, спаткаўся я са сваім добрым сябрам, Сенем, які пры гэтак званай „камуне" жыў у адной з падбеластоцкіх вёсак, а цяпер ён на пенсіі ў Беластоку. Жыў ён ціха, працавіта, палітыкай лішне не цікавіўся, а стаў сакрэтным супрацоўнікам благой улады.

— Памятаеш, жыў я ў вашай вёсцы па-суседску з геэсаўскай крамай. Пачуў ноччу нейкі стукат. Прачнуўся, глянуў у акно. Бачу, чатыры чалавекі ўзломваюцца ў краму, а побач стаіць іх самаход. Я ўстаў, паціхеньку падышоў да плота, прыкмеціў рэгістрацыйны нумар машыны, яе марку, ды вярнуўся дахаты. Калі зладзеі вынеслі тавар і ад'ехалі, пазваніў я на нумар 997, паведаміў пра ўзлом і папрасіў засцерагчы маё прозвішча. Неўзабаве ў нашу вёску прыехалі міліцыянты, разбудзілі прадаўшчыцу, агледзелі краму. Частка міліцыянтаў засталася далей рабіць абследаванне месца злачынства, іншыя паехалі на падворак уласніка аўто. Той яшчэ спаў. Разбудзілі яго і спыталіся, што ён рабіў ноччу. Ноччу ён спаў, ды ягоная дачка ездзіла на дыскатэку і яшчэ спіць з сябрамі. Разбудзілі трох хлопцаў і дзяўчыну, праверылі самаход поўны крадзенага тавару. Забралі моладзь і машыну на міліцыйную стаянку па вуліцы Бэма ў Беластоку. Праз некалькі дзён выклікалі мяне ў камендатуру міліцыі, што па вуліцы Бэма, падзякавалі за супрацоўніцтва і далі грашовую ўзнагароду, пры прыёме якой я мусіў распісацца. Іншым разам мой сусед падсмейваўся з нас, што не ўмеем жыць, а ў яго ў лесе столькі дарэмнага мяса, што хоць адбаўляй. Заўсёды пад вечар ішоў ён у лес, штось нёс пад пінжаком. Я сказаў аб гэтым міліцыянту. У суседа зрабілі вобыск, знайшлі многа мяса з казуль і дзікоў, ды да таго нелегальную паляўнічую зброю. Выклікалі мяне пасля ў ваяводскую камендатуру ў Беластоку па вуліцы Сянкевіча, 65, падзякавалі мне і зноў уручылі невялікую грашавую падзяку. Калі прапала гэтак званая „камуна", а міліцыю перахрысцілі ў паліцыю, я пра тое ўсё забыўся. Быў упэўнены, што я толькі выканаў свой грамадзянскі абавязак, дапамагаючы міліцыі выявіць злачынцаў. Але калі быў апублікаваны гэтак званы „спісак Вільдштэйна", аказалася, што я прылічаны ў гурт здраднікаў і ворагаў польскага народа, бо супрацоўнічаў з камуністычнай уладай. Я цяпер не трымаю ладоў ні з якім д'яблам і не раю нікому. Перавернецца ўсё ў палітыцы — усе „левыя", „правыя" і „каправыя" пойдуць навыварат і могуць палічыць здраднікамі ўсіх тых, хто цяпер, на іх думку, супрацоўнічае так ці іначай і з кім хочаш!

Лукаш МІКАЛАЮК

Адгаданка

		1				2	3						
				4					5	6			
												7	
		8		9		10		11					12
			13						14				

1. жонка беларуса, 2. злак з белым прадаўгаватым зернем, які расце ў вадзе і выводзіцца з паўднёваўсходняй Азіі, 3. служыцелі і пеўчыя ў хрысціянскай царкве, 4. касцявы мозг, 5. старажытнарускі багаты дом у выглядзе вежы, 6. выспа Адысея, 7. поўсцепадобная засцілка, утвораная на паверхні суконных тканін пры валянні, 8. драпежны звярок сямейства куніцавых з каштоўным футрам бурага колеру, 9. пастаянная тэндэнцыя, 10. Дэвід, XVIII-вечны англійскі філосаф і эканаміст (Hume), 11. горад на Волзе на поўдні Цвярской губерні, 12. Міхаіл Сяргеевіч, савецкі генсек і прэзідэнт, 13. вялікі японскі горад на поўдні Хонсю, 14. жывёліна мужчынскага полу.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — іспанская прыказка.

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 46 нумара

Грыва, дыполь, леў, мыш, Фрыш, чыгун, ява.

Рашэнне: **Лепшы яўны вораг чым фальшывы друг.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Лук'янюку** з Бялок і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca.

Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 26 zł., półrocznej — 52 zł., rocznej — 104 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2009 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,65 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 660 egz.

Як варажыла старая цыганка

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

— 4 —

— Квэ!

Так гучыць прывітанне на мове гуронаў-вендаке.

Калі пераступім парогі скансэна, нас прывітаюць яшчэ больш квяцістымі словамі-пажаданнем: *Хай вашая тут пабыўка будзе вясной зацікаўлення нашай гісторыі і сучаснасці.*

Усе дарогі ў рэзеравацыі вядуць у музей-скансэн. Мне падабалася на індзейскай сцежцы, найперш таму, што вярнуўся нюх, так неабходны на паляўнічым шляху. Чамусьці ад рання праследавалі мне свойскія карціны. Будучы ў рэзервацыі Квебек, я маньякальна думала пра Сухаволю (стары назоў: Сухая Яцвеж) і ксяндза-пакутніка Ежы Папялушку. І, як паказалася — недарма. Славуты скансэн, якога не абміне ніводзін турыст, знаходзіцца тут па вуліцы Станіслава Косткі. Гуроны, як і канадцы, пазначылі імёнамі святых свае вуліцы. Паколькі хрысціянскую місію вялі тут езуіты, на першым месцы ўшаноўваюцца святыя гэтага ордэна.

У рэзервацыі

Вендаке і турысты ў скансэне што па вуліцы Станіслава Косткі

* * *

Гісторыя пасёлка купаецца ў крыві і пакутах першых місіянераў-езуітаў. Праўда, самі вендаке за ўсе здзекі тут абвінавачваюць варожае племя іракезаў. Непатрэбна такі стыль прыпісваюць адным індзейцам. У падобны спосаб з місіянерамі абыходзіліся і нашы яцвягі ды прусы.

Цяжэй паверыць, што крывавыя сцэны адбываліся так нядаўна — раптам чатырыста гадоў назад. У 1609 годзе ідэаліст і падарожнік Самуэль дэ Шамплейн, пісаў агульна пра індзейцаў:

У іх нікчэмная схільнасць да помсты, усе яны вялікія ілгуны. Не можна ім верыць. Заўсёды трэба быць асцярожным і трымаць пад рукой зброю. Не ведаюць, што значыць любіць і маліцца Богу. Жывуць як дзікія бестыі, хоць думаю, што хутка павярнулі б на шлях хрысціянства. Трэба адно, каб нехта сярод іх пасяліўся і задбаў пра іх душы...

Ідэаліст дадае, што індзейцы-іракезы празывалі езуітаў „чорнымі сукенкамі" і ўспрымалі іх як сімвал зла і няшчасця. Захавалася таксама справаздача ад 16 сакавіка 1649 года пра пакутную смерць будучага святога, езуіта Жана дэ Брэбефа (Jean de Brebeuf). Гэты святы зараз карыстаецца вялікім прызнаннем сярод жыхароў рэзервацыі. Фрагмент знаходжу ў „Справаздачах езуітаў", спісаных езуітам-місіянерам Крыстофам Рэгнотам (Christophe Regnaut):

Жыць у рэзервацыі не страшна

Наехалі іракезы, занялі нашу вёску, яны схапілі айца Брэбефа і яго таварыша. Спалілі хаты. Каб адрэагаваць сваю злосць, яны абдзерлі з вопраткі манахаў і голых прывязалі да слупа. Павязалі ім рукі і ногі і сталі лупцаваць каламі. На целе пакутнікаў не было ніводнага месца, якое не было б збітае ў гэтакі жорсткі спосаб. Пасля айцоў паддалі яшчэ большым катаваннем-выпрабаваннем. Нягледзячы на боль, айцец Брэбеф безупынна прапаведаваў сваю навуку, аж тыя ад злосці і бязраднасці абрэзалі яму губы і язык. Урэшце, калі пасля доўгіх пакут святы сканаў, іракезы выдзерлі і з'елі яго сэрца. Яны верылі, што такім спосабам удасца ім займець адвагу езуіта.

* * *

Гуроны-вендаке — нацыя, якая ганарыцца сваім паходжаннем. Не без уплыву тут дабрабыт аўтахтонаў. Дамы вендаке не адрозніваюцца ад тых, у якіх пражываюць французы. Яны падобна дагледжаныя, з акуратна падстрыжанымі газонамі, часта ля іх стаяць па тры самаходы...

І не такая страшная перспектыва жыць у рэзервацыі. Гуроны, у асноўным, жывуць з турыстаў. Дзеля турыстаў працуюць дзесяткі сувенірных крамаў, бары, гасцініцы, ладзяцца фестывалі песні, танца, літаратурныя чытанні.

За свае паслугі індзейцы патрабуюць прыстойных грошай. За пабыўку ў скансэне, схаваным за агароджай з частаколу, трэба заплаціць пятнаццаць долараў. За дадатковыя грошы вас можа суправаджаць гід у індзейскім касцюме. Каб пасмакаваць традыцыйную кулінарыю, якую ў асноўным складаюць стравы з дзічыны, дынь, кукурузы трэба выдаць чарговых 20-50 долараў. Аднак найбольшыя спакусы чакаюць у сувенірных крамах. Гуроны-вендаке славяцца арыгінальнай вытворчасцю біжутэрыі і ботаў-макасінаў. Мне дадаткова пашчасціла купіць тут этнічны кампакт-дыск з шаманска-медытацыйнымі спевамі. Праўда, маё шчасце не трывала доўга. Юніёр Кінг — выканаўца — паходзіў з Арызоны (ЗША) і прадстаўляў зусім іншае племя...

— І так у цябе вялікае шчасце, — даказвалі знаёмыя.

— Шчасце!

Шчасце, большасць індзейскіх цацак выпускаюць у Індыі і Кітаі.

І тут я адчула, што кола гіторыі закруцілася. Калісьці вучылі нас, што Амерыку выкупілі ў індзейцаў за каралі і брошкі...

— Квэ!

21.12 — 27.12

(22.03. — 20.04.) Будзеш добра сам паскладваны і шмат што дасягнеш. На прафесійным грунце чакаюць цябе немалыя поспехі. Не бяры сабе на галаву ніякіх дадатковых заняткаў. Намнога спакайней будзе ў наступным тыдні.

(21.04. — 21.05.) 21-25.13. — новыя магчымасці, адкрытасць на неканвенцыянальныя развязкі і выхады з кожнай сітуацыі. Чакаюць цябе мілыя, хоць неспадзяваныя здарэнні.

(22.05. — 22.06.) Будзеш перфекцыяністам і знакамітым арганізатарам. Хоць часта не надта добры пачатак новых мерапрыемстваў, якія могуць цябе перарасці. Галавой муру не разаб'еш — у сямейных справах будзь цярплівым. Затое фізічнае ажыўленне.

(23.06. — 23.07.) З прыемнасцю зашыешся ў хаце і адарвешся ад клопатаў і неспакою. Самотны Рак можа пазнаёміцца з кімсьці ўзаемна даверлівым. Можаш пачаць дзейнасць у чымсьці новым. Трэба будзе выдаць грошы на штосьці неабходнае (мо што папсуецца?).

(24.07. — 23.08.) Будзеш рашучы, упарты, паслядоўны. Зробіш усё, каб змяніць ход падзей і мець як найбольш для сябе. У самотнага Льва гарачыя пачуцці могуць перакуліць ягоны свет. Мусіш адпачыць, бо твой арганізм збунтуецца.

(24.08. — 23.09.) Бура думак, выдатны настрой, дасціпнасць, адкрытасць на новыя кантакты. Адкрыйся на тое, што цябе сустракае і ў табе самім, а рэшту пакінь лёсу — а ён для цябе асабліва ласкавы!

(24.09. — 23.10.) Гасцей плойма, а ўсе цябе проста не могуць нахваліцца! Дасканалы настрой, добрая забава. Добра адпачнеш, адновіш сілы. А калі трапіць табе ў вока хтосьці асаблівы, дык аж падкосяцца табе ногі. Знойдзеш выхад з усіх сітуацый 21-25.12. Ды 23-27.12. не падпісвай ніякіх дамоў, бо могуць быць спрэчкі, якіх вынік цяжка прадбачыць.

(24.10. — 22.11.) Найбольш прыемнасці з рандэву. Карыстайся ўсімі запрашэннямі (з 26.12. можаш сустрэць свой ідэал — спантанны, кемлівы, творчы, незалежны). 20-25.12. пагражаюць табе аварыі, старайся таксама не сапернічаць і не навязваць нікому сваёй думкі, кантралюй эмоцыі.

(23.11. — 22.12.) Шчасце ў латарэях і іншых іграх. Час вельмі працавіты, у фірме міла і прыемна, хоць трапіцца хтось такі, што будзе цябе раздражняць сваім благім настроем і нараканнем (абмінай яго шырокім кругам!).

(23.12. — 20.01.) Засяродзься на рашучай рэалізацыі ўласных ідэй. Хоць будзеш мусіў крыху паскнарыць, але назбіраеш крыху грошай. Ад лішку поспехаў хай табе не перавернецца ў галаве!

(21.01. — 19.02.) Дасканалы кантакт з атачэннем, а пачуццёвыя справы набяруць бляску. Апошнюю дэкаду года варта правесці за мяжой. Правер у лекара свае горла і шчытавідку (тарчыцу).

(20.02. — 21.03.) Дагаворышся з блізкімі (урэшце знойдзеш для іх час!). Чым больш будзеш самаўпэўнены, тым менш цябе заспее. Рызыкі не бойся, лёс спрыяе табе. Калі гаворка пра нямогласці, дык найгоршае ў іх — недахоп інфармацыі; даведайся — спакайнейшы будзеш.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960